Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 4 1933 г. АУТОРАК № 145 (4589)

Год выданьня XVI

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б) АБ РАБОЦЕ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ (1 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Да другога зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Г. Р-ВА — З бальшавіцкай праматой ускрыць памылкі (2 стар.).

АБ ЗАДАЧАХ УсеЦСПС І ПРАФСАЮЗАЎ У СУВЯЗІ З ПЕРАДАЧАЙ ІМ ФУНКЦЫЙ НАРКАМПРАЦЫ — Даклад тав. ШВЭРНІКА на 3 пленуме УсеЦСПС 29 чэрвеня 1933 г. (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Афіцыяльная нота ангельскага ўраду аб скасаваньні эмбарго (4 стар.).

Спроба нападу на гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі (1 стар.).

Далейшае закрыцьцё капальняў у Верхняй Сілезіі (4 стар.).

Да другога зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

У сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне сяўбы наша рэспубліка вышла наперад. Але мы мелі ўсе маг чымасьці значна раней і значна лепш васеяць яравыя. Упушчанае ў часе веснавой сяўбы трэба пагнаць бальшавіцкім правядзеньнем папарава-праполачнай кампаніі, уборкі ўраджаю і збожжаздачы.

Заходняя вобласьць выклікала нас на далейшае спаборніцтва на лепшым і хутчэйшым ворыве папараў, поліве, падрыхтоўцы да ўборкі і збожжаздачы.

Пасьпяховае правядзеньне папарава-праполачнай кампаніі, падрыхтоўкі да ўборкі і збожжаздачы ў значнай, рашаючай ступені вырашае пэратыўнае ў жыцьцё лёзунгу тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі і ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Ад посьпеху правядзеньня папарава-праполачнай кампаніі будзе залежыць далейшы рост калгаснай вытворчасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Пастановай ЦК КП(б)Б на 10 ліпеня склікаецца другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Зьезд падагуліць вынікі веснавой сяўбы і дасьць практычную пуцёўку па выкананьні адказьнейшых задач уборачнай кампаніі і пастаўкі с-г. прадуктаў пралетарскай дзяржаве.

Задача кожнага раёну, кожнага калгасу—прысьці да зьезду з канкрэтнымі бальшавіцкімі паказальнікамі па падрыхтоўцы і правядзеньні ўборачнай кампаніі, па здачы с-г. прадуктаў дзяржаве.

Узараць і добра ўзараць чыстыя па пары, прапалоць усе пасевы, асабліва ільну, прабаранаваць бульбу, убраць усю сенажаць з тым, каб ні на адзін дзень не зацягнуць уборкі ўраджаю і пастаўкі с.-г. прадуктаў дзяржаве—вось у чым цэнтр асноваасноў. Іменна гэта зьяўляецца рашаючым у падрыхтоўцы да зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Як у нас стаіць справа? Сёньня трэба з усёй рэзкасьцю падкрэсьліць, што пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы таму-другому ўскружыла гаслу, многія раённыя і цэнтральныя арганізацыі пасьля сяўбы раптыі зрабіць перадышку.

Толькі гэтым можна тлумачыць, што ў справе ворыва папараў Заходняя вобласьць нас абагнала, выканаўшы плян на 103 проц. і ўзараўшы 700 тыс. гэктараў. Ня гледзячы на тое, што БССР скончыла сяўбу раней, чым Заходняя вобласьць, мы ўзаралі толькі 227.026 га папараў—54,1 проц. заданьня.

У радзе месц мы назіраем яўнае супраціўленьне ворыву папараў, якое часта мяжуе з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі ўтаіць сапраўдную колькасьць зямлі ў раёне.

Яркім прыкладам супраціўленьня ворыву папараў можа паслужыць Любаньскі раён, які павінен быў узараць да 1 ліпеня 3.000 гэктараў. Замест таго, каб пераключыцца адразу-ж пасьля сяўбы на ворыва папараў, загадчык райземаддзелу Старавойтаў і райагранам Кірзенка 15 чэрвеня, у адказ на дасланы плян ворыва папараў, пішуць Наркамзему: «Усе плошчы ў раёне зайнты пад пасевы азімых і яравых. Чыстых папараў няма і ня будзе».

Заява сапраўды безагаворачная, яна разьлічана на тое, каб пусьціць пыл у вочы, каб ашукаць дзяржаву і грамадзкасьць.

Як-жа на справе? Аказваецца, толькі ў адным Асавецкім сельсавеце было выяўлена каля 100 га чыстых папараў. Есьць цэлы шмат зележных земляў, якія можна скарыстаць пад папары. Замест таго, каб выявіць незанятыя пасевамі землі і разгарнуць ворыва папараў, апартуністы з райземаддзелу стрыяюць утойванью гэтых земляў. Ня дзіва, што Любаньскі раён на 1 ліпеня ўзараў усяго 53 гэктары папараў—2,1 проц.

Любань—не выключэньне. Такія-ж тэндэнцыі ўтаіць сапраўдную колькасьць зямлі і скараціць пляны ворыва папараў мы бачым і ў радзе іншых раёнаў, як **МСЬЦІСЛАЎСКІ, МАЗЫРСКІ, РАСОНСКІ, ПЯТРЫКОЎСКІ.**

Прапуленьнем аптымізаваных месяцных тэндэнцый, накіраваных на зрыў заданьняў пралетарскай дзяржавы,—бязьлітасны адпор!

Рашчтаваць усебеларускаму зьезду калгасьнікаў аб поўным скасаваньні **ВОРЫВА ПАПАРАЎ**—галавая задача кожнага калгасу, кожнага раёну.

Адным з важнейшых зьвеньняў у летнім цыклі сельска-гаспадарчых работ зьяўляецца **СЕНАЎБОРКА.** Сена—гэта кармовая база для рабочай і прадукцыйнай жывёлы. Пасьпяховае правядзеньне сенаўборкі—гэта сур'ёзны крок на шляху рэалізацыі лёзунгу тав. Сталіна аб калгаснай заможнасьці.

ЦК КП(б)Б вызначыў 15 чэрвеня, як пачатак сенажацьня ў БССР. На заліўных і балотных сенажацях, па сеяных травах мы павінны зьняць ня менш двух укосаў. Прайшло пят нацаць ужо дзён з пачатку сенаўборачнай кампаніі. Між тым, паводле даных Наркамзему на 1 ліпеня, касьбу пачалі толькі 40 раёнаў. Скошана ўсяго 33.161 гэктар—1,5 проц. плану. Больш за ўсё адстаюць саўгасы, якія скасілі толькі 3.000 гэктараў. І гэта пры наяўнасьці значнай колькасьці складаных сенаўборачных машын, якімі можна ўбраць ня менш 50 проц. сена мэханічным спосабам.

Рад раёнаў, як **БРАГІНСКІ, БУДА-КАШАЛЕЎСКІ, ВЕТКАЎСКІ, КАМАРЫНСКІ** і інш., яшчэ не пачыналі касьбы.

Паданыя факты паказваюць, што па адным з важнейшых вучасткаў сельска - гаспадарчай вытворчасьці ствараецца рэальная пагроза зрыву.

Нельга дапусьціць ні на адзін дзень, ні на адну гадзіну зацягнуць пачатак сенаўборкі. На гэтым вучастку павінен быць забясьпечан карэнны пералом у бліжэйшыя-ж дні. Барацьба за два ўкосы, барацьба за поўнае і своячасовае выкананьне пляну сенаўборкі да пачатку ўборкі збожжавых,—вось баявая і асноўная задача.

КОЖНЫ РАЁН, КОЖНЫ КАЛГАС ПАВІНЕН РАПАРТАВАЦЬ ЗЬЕЗДУ АБ БАЛЬШАВІЦКІМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЕНАЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

Самай галоўнай задачай у падрыхтоўцы да зьезду зьяўляецца сапраўды баявая арганізацыя работ па правядзеньні паставак с.-г. прадуктаў дзяржаве.

ЗДАЦЬ У ТЭРМІН ЗБОЖЖА, БУЛЬБУ, ЛЁН І ІНШЫЯ ПРАДУКТЫ ДЗЯРЖАВЕ, ПРЫЧЫМ ПРАДУКТЫ САМАЙ ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦІ—ПЕРШАЯ ЗАПАВЕДЗЬ.

Жалезны, бальшавіцкі адпор найменшым спробам ашукаць пралетарскую дзяржаву, малейшым антыдзяржаўным тэндэнцыям, злачынному зьмяншэньню ўраджайнасьці ў паасобных раёнах, аб чым мы пісалі ў папярэдніх нумарох «Зьвязды».

У корані перасякаць усякія тэндэнцыі і спробы ашукаць дзяржаву, падбальшавіцку арганізаваць датэрміновае і поўнае выкананьне паставак с.-г. прадуктаў дзяржаве — найпершая і рашаючая задача.

Падрыхтоўка і правядзеньне другога зьезду калгасьнікаў-ударнікаў—кроўная справа рабочых мас, шэфскіх арганізацый. Пралетары гораду павінны забясьпечыць своячасовы і поўны выпуск запасных частак да ўборачнага інвэнтару і машын. Рабочыя заводаў і фабрык павінны аказаць усямерную дапамогу ў правядзеньні рамонту ўборачных машын з тым, каб да пачатку ўборкі (а засталіся лічаныя дні) кожны трактар, кожная жнівярка і іншыя машыны і інвэнтар былі прыведзены ў поўную баявую гатоўнасьць.

СУСТРЭНЕМ ДРУГІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ - УДАРНІКАЎ БАЛЬШАВІЦКІМІ ПАКАЗАЛЬНІКАМІ НА ФРОНЦЕ ПАПАРАВА-ПРАПОЛАЧНАЙ І ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ, НА ФРОНЦЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ДАТЭРМІНОВУЮ, ПОЎНУЮ І ВЫСОКАЯКАСНУЮ ПАСТАЎКУ С.-Г. ПРАДУКТАЎ ДЗЯРЖАВЕ!

ПЕРШАЧАРГОВЫ АБАВЯЗАК—ЗДАЧА ЗБОЖЖА

РАГАЧОЎ. ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ» ПАБАЛАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗЬВЯРНУЎСЯ З ЛІСТОМ ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ РАГАЧОЎШЧЫНЫ І БССР.

— ПЕРШАЧАРГОВЫ АБАВЯЗАК КАЛГАСЬНІКАЎ—ГАВОРЫЦЦА Ў ЛІСЬЦЕ,—ПОЎНАСЬЦЮ І ДА ТЭРМІНУ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА. ГЭТА ЗАДАЧА ЎСІХ ЗАДАЧ. УДАРНІКІ «ЧЫРВОНАЙ АРМІІ» АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫКАНАЦЬ СВОЙ ПЛЯН ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА Ў 94 ЦЭНТНЭРЫ РАНЕЙ ТЭРМІНУ.

ДЛЯ ГЭТАГА ЯНЫ ВЫЛУЧЫЛІ Ў КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ЗЬВЕНЬНІ ПА БЕСЬПЕРАПЫННАЙ ВЫВАЗЦЫ ЗБОЖЖА НА ПРЫЁМАЧНЫЯ ПУНКТЫ. КАЛГАСЬНІКІ ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЗДАВАЦЬ ЗБОЖЖА З ПЕРШАГА АБМАЛОТУ, ПРОСТА З ПАД МАЛАТАРНІ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ВЫВОЗІЦЬ НА ПУНКТЫ КАШТОЎНЕЙШЫЯ КУЛЬТУРЫ—ПШАНІЦУ І ІНШ., АРГАНІЗАВАЦЬ МАЛАЦЬБУ НА ТРЭЦІ ДЗЕНЬ ПАСЬЛЯ ПЕРШАГА ЖНІВА, УБОРКУ І МАЛАЦЬБУ СКОНЧЫЦЬ НА ПРАЦЯГУ 10 ДЗЕН. АРГАНІЗАВАНА ДРУЖЫНА АХОВЫ ЎРАДЖАЮ Б 4 КАЛГАСЬНІКАЎ-КАМСАМОЛЬЦАЎ. ГАЛУБІЦКІ, КІТАЙЧЫК, ЧАРНЯЦОЎ.

АБ РАБОЦЕ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) устанаўляюць, што ня гледзячы на няўхільны рост тэхнічных сродкаў чыгунных і паляпшэньне матар'яльных умоў жыцьця чыгуначнікаў, плян чыгуначных перавозак сыстэматычна ня выконваецца і размер перавозак ня толькі не павялічыўся, а наадварот, зьменшыўся за першы квартал 1933 г. да 61 млн. тон супроць 67 млн. тон у першым квартале мінулага году. Пачатае паляпшэньне ў рабоце чыгунак у зімовы пэрыяд 1931-32 г. г. НКШЗ і дарогамі ня было замацавана. У рэзультаце—ганебнае для чыгуначнага транспарту павялічэньне крушэньняў, дробных аварый на дарогах.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) лічаць галоўнай прычынай зусім незадавальняючай работы чыгунак недахопы кіраўніцтва, недахопы арганізацыйнага характару, усё яшчэ ня зжыт канчаткова збанкрутэваўшы канцылярска-бюракратычны мэтад кіраўніцтва чыгункамі, пачынаючы ад раёнаў і дырэкцый і канчаючы цэнтральнымі кіраўніцтвамі НКШЗ.

Нельга далей цярпець цяперашнюю, зусім няправільную арганізацыю зарплаты, у аснове якой усё яшчэ ляжыць ураўніўка і пры якой зарплата рабочых і служачых тым вышэй, чым бліжэй работнікі да канцылярыі і чым далей яны ад дэпо, ад майстэрні, ад станцыі і наогул ад работы на лініі.

Нельга далей цярпець даведзеную да крайнасьці шматлікасьць і дробнасьць норм выпрацоўкі і расцэнак, якія блытаюць рабочых і дэзарганізуюць работу, таксама нельга цярпець такога становішча, калі адказная справа нармаваньня працы і ўстанаўленьня расцэнак даручана не майстрам і іншым апэрацыйным кіраўніком у дэпо, на станцыях, на дарогах і ў НКШЗ, а другарадным работнікам з канцылярый, адарваным ад жывой работы.

Нельга далей цярпець такога становішча, што дзьве трэці часткі інжынэрна-тэхнічных работнікаў чыгуначнага транспарту запаўняюць канцылярыі раёнаў, дырэкцый і НКШЗ, а на лініі засталася толькі $^1/_3$-я частка складу інжынэрна-тэхнічных работнікаў транспарту. У рэзультаце гэтага рашаючыя вучасткі транспарту — дэпо, станцыя, дыстанцыя лініі і сувязі працуюць без кваліфікаваных тэхнічных сіл і не спраўляюцца са сваёю работаю.

Нельга далей цярпець такога становішча, калі кіруючыя работнікі падбіраюцца не па дзелавой адзнацы, калі камуністы з кіруючых кадраў, займаючы адказныя пасты на транспарце, ня ведаюць, не вывучаюць сур'ёзна тэхнікі справы і попусту фанабэрацца сваім партыйным білетам, тым часам як ведаючыя справы і ўмеючыя кіраваць беспартыйныя работнікі адціраюцца ад кіраўніцтва таму толькі, што ў іх няма партыйнага білету.

Нельга, нарэшце, цярпець такога становішча, калі кіраўнікі раёнаў дарог і кіраўніцтваў НКШЗ зводзяць задачы кіраўніцтва да дачы «агульных дырэк тыў» і шматлікіх загадаў, ня бачачы таго, што галоўнае кіраўніцтва цяпер заключаецца ў фактычнай штодзённай ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАНЬНЯ дырэктыў і загадаў на месцы—у дэпо, на станцыі, у дыстанцыі. Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны камітэт УсеКП(б) асобна адзначаюць зусім ненармальнае становішча дырэкцыі дарогі ў існуючай сыстэме кіраўніцтва чыгуначнага транспарту. Гэта ненармальнасьць заключаецца перш за ўсё у тым, што ўстаноўленая пастановай Савету Народных Камісараў і Цэнтральнага камітэту УсеКП(б) у 1931 г. скарачэньне апарату раёнаў і зьнішчэньне ў ім грубых скажэньняў функцыянальнага тыпу ня было праведзена ў жыцьцё і раёны на практыцы ператварыліся ў нешта накшталт маленькіх дырэкцый дарог, якія прашкаджаюць цэнтралізаванаму кіраванню дарогай. З другога боку, паасобныя цэнтральныя кіраўніцтвы НКШЗ ня рэдка праб'юць непасрэдна кіраваць пінейнымі органамі праз галаву дырэкцый дарог, чым ствараецца недапушчальная блытаніна ў кіраваньні дарогамі.

Рэзультатам гэтых і падобных ім недахопаў зьяўляецца нездавальняючая работа чыгуначнага транспарту і зусім недапушчальная становішча раду галін чыгуначнай гаспадаркі.

Прыкладамі такога недапушчальнага становішча чыгуначнай гаспадаркі зьяўляюцца такія факты як:

а) расхіданасьць капітальных работ па вялікай колькасьці новых аб'ектаў замест сканцэнтраваньня капітальных работ на асноўных вучастках існуючай чыгуначнай сеткі;

б) закінутасьць работы з вагонным паркам замест вылучэньня яго ў самастойную частку чыгуначнай гаспадаркі;

в) практыка ўстанаўленьня надта зьніжаных норм для рамонту паравозаў і вагонаў, якая вядзе да недапушчальнага зьніжэньня якасьці рамонту і частковага разбурэньня паравоза-вагоннай гаспадаркі;

г) усё яшчэ нярэдкім зьяўляецца фармальнае правядзеньне спаранай яды на паравозах, на недапушчальнасьць чаго ня раз указвалі партыя і урад;

д) эапушчанасьць пінейнай гаспадаркі, якая суправаджаецца пры гэтым правядзеньнем раду тэхнічна недапушчальных «упрашчэнцкіх» мерапрыемстваў.

Яркім прыкладам нездавальняючага кіраўніцтва на чыгуначным транспарце зьяўляецца становішча апарату НКШЗ і дарог, разбурэньне якога, асабліва ў цэнтры, ня толькі ня спынілася, але да апошняга часу ўзрастала далей. Пры тым жа ў апараце чыгуначнага транспарту зьнізу да верху—на станцыях, дэпо, у раёнах, дырэкцыях і НКШЗ—дайшло да апошніх межаў награмаджэньне ўскладнага роду дапаможных органаў кіраваньня. Тут мы маем адно з найгоршых праяўленьняў так званай «функцыянальнай сыстэмы» ў кіраваньні, якое выражаецца ў штучным вылучэньні раду функцый з міностваў зусім непатрэбных аддзелаў і сэктароў, што вядзе, замест сканцэнтраваньня справы кіраваньня дэпо, станцыяй, раёнам, дарогай, да яе расканцэнтраваньня, да ўстараненьня сапраўднага апэрацыйнага кіраўніцтва і да зьнішчэньня сапраўднай адказнасьці за гэта кіраўніцтва, г. зн. да абязьлічкі кіраваньня і абязьлічкі адказнасьці, замест так неабходнага на транспарце ўмацаваньня адзінаначальля. Яшчэ больш яркім прыкладам нездавальняючага кіраўніцтва трэба прызнаць шматлікасьць, крушэньняў і дробных аварый, якія зьяўляюцца рэзультатам недысцыплінаванасьці, дрэнная работы камуністаў, адсутнасьці ў іх рэвалюцыйнай пільнасьці. Вялікая колькасьць крушэньняў адбываецца з-за гарэньня букс з-за злачынна-неахайнай змазкі вагонаў у дарозе. На змазчыкаў не зварачаецца належнай увагі. Старых кваліфікаваных змазчыкаў чугункі растрацілі. Работы па павышэньні кваліфікацыі змазчыкаў, па зьнішчэньні вялікай цякучасьці не вядзецца. На гэту простую, але надзвычай важную пасаду набіраюць каго папала. Часта сюды запязаюць адкрытыя ворагі, бюгвардзейцы і кулакі, атрымліваюць магчымасьць разбураць адказнейшую частку чыгуначнай гаспадаркі—вагоны. Паравозная і вагонная змазка ў вялікай колькасьці раскрадаецца, дзякуючы поўнай безкантрольнасьці з боку адміністрацыі. Вагоны застаюцца бяз змазкі ў дарозе, у лепшым выпадку адчапляюцца пры гарэньні букс, а часта гэта прыводзіць да катастроф і цягне за сабою псаваньне рухомага складу, грузаў, чапавечыя ахвяры і спыненьне руху. У такіх умовах змаз чык фактыўна ператвараецца ў арганізатара аварый і крушэньняў.

Ня гледзячы на тое, што чыгуначны транспарт зьяўляецца найбольш цэнтралізаваным з усіх галін народнай гаспадаркі СССР, які набліжаецца па тыпу да ваеннай арганізацыі, арганізацыя работы на транспарце і ўвядзень не жалезнай дысцыпліны далёка адстаюць ня толькі ад ваенных арганізацый, але і ад раду галін прамысловасьці. Здавалася-б, што ў гэтых умовах на чыгунках партыйная арганізацыі і работнікі камуністы, якія працуюць на транспарце павінны былі-б пра явіць сваю клясавую пільнасьць і чуласьць для пасьпяховага выкрыцьця клясава-варожых элементаў і барацьбы з імі. Здавалася-б, што партыйныя арганізацыі павінны былі адпаведна ўзмацніць сваю партыйна-масавую работу для ўзьняцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва, для ўзьняцьця дысцыпліны і баявога духу працуючых. Аднак, гэтага на большасьці чыгунак, раёнаў, станцый, дэпо няма. Многія партыйныя ячэйкі праяўляюць палітычную сьлепату і не выкрываюць клясавых ворагаў, якія праляізаюць на чыгункі і прабуюць весьці шкодніцкую і разлагаючую работу. Супроць прагульшчыкаў, пятуноў і іншых дэзарганізатараў вытворчасьці на чыгунках ня створана яшчэ належнай атмасфэры ўсеагульнага асуджэньня і ганебнага выпаньня іх з радоў чыгуначнікаў. Рад камуністаў ня толькі не ўзначальваюць барацьбы з разгільдзяйствам, разбэшчанасьцю, якія вядуць да крушэньняў, але самі дапускаюць парушэньні працоўнай дысцыпліны і зьяўляюцца непасрэднымі вінаўнікамі аварый і крушэньняў. Рад партыйных ячэек, замест разгортваньня палітычнай работы у масах, на аснове глыбокага вывучэньня вытворчых пытаньняў і аўладаньня тэхнікай чыгуначнага транспарту, па сутнасьці, на справе займаецца засядальніцкай мітусьнёю, дубляваньнем работы гаспадарнікаў, павярхоўнай кампанейшчынай. На чыгуначным транспарце больш чым у якой небудзь іншай галіне народнай гаспадаркі наглядаюцца выпадкі інжэўдарніцтва і «очковтирательства».

Паляпшэньне ў сэнсе ўкараненьня дысцыпліны, якое наглядаецца за апошнія паўтара гады ў сувязі з арганізацыяй інстытуту парторгаў на чыгуначным транспарце, зусім не выстарчальна для сапраўднага пералому ў рабоце чыгунак.

Для дасягненьня належных рэзультатаў у справе насаджэньня сьвядомай пралетарскай дысцыпліны на чыгуначным транспарце неабходна зрабіць наступны крок, а іменна: увесьці па ўсёй сеткі чыгунак сыстэму паліт аддзелаў.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Для ліквідацыі арганізацыйных недахопаў у справе кіраўніцтва чыгуначным транспартам:

а) умацаваць адзінаначальле і ўзмацніць адказнасьць кіраўнікоў за даручаную ім справу, ліквідаваўшы мноства намесьнікаў як у НКШЗ, так і на дарогах;

б) узяць справу разьмеркаваньня кадраў і праверкі выкананьня з веданьня другарадных работнікаў і падначаліць яе непасрэдна ў НКШЗ — народнаму камісару, на дарогах — начальнікам дарог, у раёнах, на станцыях і ў дастанцыях — адпаведным начальнікам;

в) узьняць гаспадарчае значэньне і адказнасьць дарогі, падначаліўшы непасрэдна дырэктару (начальніку) дарогі, раёну, дэпо, дыстанцыі, лініі і сувязі з стварэньнем у кіраўніцтве дарогі адпаведных служб;

г) рэарганізаваць раёны, абмежаваўшы іх функцыі галоўным чынам функцыямі рэгуляроўкі руху;

д) скараціць агульную колькасьць служачых ва ўсёй сыстэме НКШЗ і асабліва ў самым НКШЗ і ў раёнах, скасаваць значную частку функцыянальных аддзелаў і пасад з тым, каб вызваляючыхся інжынэраў, тэхнікаў і гаспадарнікаў перавесьці на работу ў дэпо, на станцыі, у дыстанцыі, на лініі і сувязі;

е) сканцэнтраваць работу кіраўнікоў чыгуначнага транспарту зьверху да нізу па непасрэдным апэрацыйным кіраўніцтве дарогай, дэпо, станцыямі, дыстанцыямі, лініяй і сувязьзю, максімальна скараціўшы колькасьць загадаў і статыстычную справаздачнасьць;

ж) назначэньне на кіруючыя гаспадарча-тэхнічныя пасады ў дэпо, на станцыі, у дыстанцыі, у раёне і на дарозе рабіць як у адносінах камуністаў, так і ў адносінах беспартыйных спэцыялістаў шляхам папярэдняй праверкі адпаведных кандыдатаў праз спэцыяльныя атэстацыйна-іспытныя камісіі, якія ўстанаўляюцца ў кожным прадпрыемстве (гаспадарчай арганізацыі) пад непасрэдным кіраўніцтвам адпаведнага начальніка прадпрыемства (гаспадарчай арганізацыі).

2. Для ліквідацыі недахопаў у сыстэме заработнай платы і ў практыцы нармаваньня працы:

а) забясьпечыць больш высокую заработную плату для рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў, непасрэдна занятых на лініі (дэпо, станцыя, дыстанцыя, лінія і сувязі);

б) палепшыць сыстэму прагрэсыўна-прэміяльнай аплаты працы, устанавіўшы для вядучых груп рабочых павышэньне прагрэсыўнай расцэнкі, а ў дэпо прэміяваньне;

в) павялічыць фонд заработнай платы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, занятага непасрэдна на вытворчасьці з тым, каб інжынэр і тэхнік, якія працуюць на станцыі, дэпо, у дыстанцыі лініі і сувязі атрымлівалі аклады вышэй на 15 проц., чым роўнацэнныя па кваліфікацыі работнікі ў апаратах кіраўніцтва дарог і НКШЗ;

г) ліквідаваць шматлікасьць і дробнасьць норм выпрацоўкі і расцэнак, ускладнёўшы непасрэдную адказнасьць за справу нармаваньня на гаспадарчых тэхнічных кіраўнікоў.

3. У мэтах палепшэньня асноўных галін чыгуначнай гаспадаркі:

а) сканцэнтраваць капітальныя работы на асноўных вучастках існуючай чыгуначнай сеткі, за кошт памяншэньня раскіданасьці гэтых работ, у прыватнасьці за кошт новых ліній;

б) перагледзець нарматывы для рамонту паравозаў і вагонаў, як празьмерна нізкія і шкодныя для чыгуначнай гаспадаркі;

в) падзяліць кіраўніцтва (службу) цяг на 2 кіраўніцтвы (службы) — на кіраўніцтва паравозаў і кіраўніцтва вагонаў, усямерна ўзмацніўшы кіраўніцтва, якое ведае вагонным паркам і яго рамонтам.

4. Рэарганізаваць інстытут парторгаў, стварыўшы палітаддзелы па чыгуначным транспарце з падначаленьнем палітаддзелам усіх партыйных арганізацый на чыгуначным транспарце.

5. Неадкладна прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё зацьвердженага ЦВК і СНК Саюзу ССР дысцыплінарнага статуту на чыгунках і забясьпечыць на аснове яго правядзеньня ўстанаўленьне цьвёрдай працоўнай дысцыпліны.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР МОЛАТАЎ.
Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) — І. СТАЛІН.

3 ліпеня 1933 году.

Яшчэ адна буйная перамога

Мірная палітыка савецкага ўраду дала яшчэ адну буйную перамогу. Брытанскі ўрад 1 ліпеня мусіў прызнацца перад усім сьветам, што яго спроба аказаць грубы націск на Савецкі саюз пры дапамозе эмбарго на ўвоз савецкіх тавараў ПОЎНАСЬЦЮ ПРАВАЛІЛАСЯ.

Савецкі саюз з гонарам сустрэў антысавецкі выпад цьвёрдалобых і непахісна праводзіў далей сваю палітыку, палітыку міру. Цэлых тры месяцы патрэбна было для таго, каб ангельскі імпэрыялізм пераканаўся ў моцы і непахіснасьці Савецкага саюзу, каб ён зразумеў, што яго антысавецкі выпад б'е ў першую чаргу па яго-ж уласным гандлі і прамысловасьці. А гэта-ж ужо на першы выпадак, калі антысавецкія прыпадкі цьвёрдалобых канчаюцца такім чынам.

Аднак, на гэты раз цьвёрдалобыя высьцебалі сябе вельмі моцна. Ужо адзін той факт, што ангельскі ўрад сам, па сваёй упаснай ініцыятыве, ня толькі скасаваў эмбарго, але і зрабіў наступны крок, запрапанаваў 3 ліпеня пачаць перарваныя ў сакавіку гэтага году перагаворы аб заключэньні новага гандлёвага дагавору з СССР, — ясна гаворыць аб гэтым.

Авантурысцкія элементы ангельскай буржуазіі, якія актам эканамічнага нападу на Савецкі саюз (чым па сутнасьці і было эмбарго) хацелі мабілізаваць усе міжнародныя антысавецкія сілы для арганізацыі вайны супроць СССР, — трымалі добрую навуку. Іх надзеі, што эмбарго выявіць слабасьць Савецкага саюзу, не апраўдаліся. Наадварот, тут выявілася слабасьць брытанскага імпэрыялізму, не разьлічыўшага таго ўдару, які ён нанёс сваёй жа буржуазіі.

Эмбарго было выгодным толькі некаторым канадзкім, новазэляндзкім і эўстралійскім копам, якія атрымалі магчымасьць узьняць цэны на свае тавары. І ў дадатак яно супала з рэзкім абвастрэньнем англа-амэрыканскай барацьбы за рынкі і пагаршэньнем англа-японскіх адносін і яшчэ больш па горшыла становішча ангельскага замежнага гандлю і ангельскай прамысловасьці.

Дзелавыя колы вельмі хутка зазнажылі ў палітыцы эканамічнай вайны супроць СССР трывожную адзнаку, якая неадлучна сьледавала за імі ўсюды. Яны хутка зразумелі, што АЖЫЦЬ ЦЯВІЦЬ ОТТАЎСКІЯ ПАСТАНОВЫ ЯК ТАК ЛЁГКА, як гэта здавалася ў красавіку месяцы. Цэлы рад буйнейшых і ўплывовых ангельскіх фірм, якія многа пацярпелі ад эмбарго, зарэагавалі на гэту палітыку кансэрватараў шматлікімі пратэстамі.

Яшчэ хутчэй распазналі сапраўдны сэнс і мэты эмбарго ангельскія рабочыя. Пачынаючы ад дня яго абвяшчэньня, у Англіі ня спыняўся магутны рух пратэсту супроць антысавецкіх замыслаў ангельскіх імпэрыялістаў. Сотні сходаў і тысячы рэзалюцый пратэсту, прынятых самымі рознымі работчымі арганізацыямі, сьведчаць аб тым, якое моцнае было абурэньне шырокіх ангельскіх рабочых мас абвяшчэньнем эмбарго.

Але галоўнае заключаецца ў тым, што цьвёрдалобыя ашукаліся яшчэ ў адным: ЗА ІХ ПРЫКЛАДАМ НЕ ПАЙШЛА НІ АДНА КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ КРАІНА, а контр-меры, якія прымушан быў прыняць СССР, балюча ўдарылі па самой Англіі. Застаўшыся адзінокім, ангельскі імпэрыялізм прымушан быў зьмяніць сваю палітыку ў адносінах да СССР.

Яшчэ адзін чарговы антысавецкі манэўр цьвёрдалобых ганебна праваліўся, разьбіўшыся аб сталёвую сьцяну мірнай палітыкі савецкага ўраду.

Паведамленьне ТАСС

У часе наведаньня японскім паслом у Маскве другога ліпеня г.г. п. ОТА намесьніка народнага камісара па замежных справах тав. Г. Я. САКОЛЬНІКАВА апошні давёў да ведама п. Ота рэзультаты расьсьледаваньня, праведзенага савецкімі прадстаўнікамі на Камчатцы пад кіраўніцтвам упаўнаважанага НКЗС. Тав. Г. Я. САКОЛЬНІКАЎ паведаміў, што хаця сьледзтва поўнасьцю яшчэ не закончана, аднак, рад фактаў ужо устаноўлен з дастатковай бясспрэчнасьцю. Як высьвятлена сьледзтвам, сутычка паста пагранічнай аховы з трыма японскімі рыбакамі мела месца 15-га чэрвеня г. г. у раёне мысу Ольга, на ўсходнім узьбярэжжы Камчаткі. Няправільна называўся як месцаздарэньня мыс Кроноцкі, дзе паста пагранічнай аховы няма.

Высьветлілася, што асабовы склад пагранічнага паста каля мысу Ольга пасьля сутычкі зьнік. Росшукі яго праводзяцца далей. Аднак, на падставе выяўленых у памяшканьні пагранпаста дакумантаў, факт абстрэлу трох японскіх рыбакоў устаноўлен, пры чым устаноўлена таксама, што гэтыя рыбакі былі забіты ў абстаноўцы, выключаючай права для страляўшых ужываць зброю.

Нам. Наркома замежных спраў тав. Г. Я. Сакольнікаў заявіў японскаму паслу, што ў сувязі з парушэньнем пастом у даным выпадку існуючых інструкцый савецкі ўрад прыйме меры да суровага пакараньня асоб, проста ці сукосна вінаватых у гэтай справе, і да кампэнсацыі сем'ям забітых страты, нанесенай ім няправільнымі дзеяньнямі пагранічнага паста.

Спроба нападу на гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі

ТОКІЁ, 3. (БЕЛТА). Сёньня каля 11 гадзін раніцы была зроблена спроба нападу на гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі тав. КОЧАТАВА. Зама хавец узброен шабляй японскага ўзору, сачыў за пераездам тав. Кочатава, які ехаў на аўтамабілі з паўнамоцнага прадстаўніцтва ў гандлёвае прадстаўніцтва. Замахавец кіраваў сваю машыну ўсьлед за аўтамабілем тав. Кочатава і ўскочыў у пярэднюю гандлёвага прадстаўніцтва ў той момант, калі тав. Кочатаў падымаўся на другі паверх. Апынуўшыся перад групай супрацоўнікоў гандлёвага прадстаўніцтва, пераважна японцаў, замахавец стаў пагражаць групе шабляю і пабіў шкляныя дзьверы. Пасьля гэтага ён выбег на вуліцу і, ускочыўшы на чакаўшы яго аўтамабіль, прабазаў скрыцца. Згодна апошніх вестак, замахавец знаходзіцца ў руках паліцыі. Яго імя СУРЫНАТЭ КАЗЫМЕ. Ён заявіў, што зьяўляецца старшынёю рэакцыйнай арганізацыі «Конумэйсо».

* * *

ТОКІО, 3. (БЕЛТА). У хуткім часе пасьля спробы нападу на тав. К

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЧЫСТКА ПАРТЫІ АДЫГРЫВАЕ ВЯЛІЗАРНУЮ РОЛЮ У ПАВЫШЭНЬНІ ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНАГА УЗРОЎНЮ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ

П. Пасюкевіч

член віцебскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б

ПЕРАТВАРЫЦЬ ЧЫСТКУ ПАРТЫІ У МАГУТНЫ СРОДАК ЛЕПШАГА ВЫКАНАНЬНЯ ГАСПАДАРЧЫХ ЗАДАЧ

Чыстка віцебскай партарганізацыі разгортваецца і прымае масавы характар. Арганізавана 13 праверачных ячэйковых камісій, з іх 10 прыступілі да працы (тры прыступаюць у бліжэйшыя дні). Канчаткова праверана 13 парт'ячэек з агульнай колькасьцю камуністаў каля 500 чалавек (галоўным чынам, парт'ячэйкі навучальных устаноў і частка вытворчых). Выключаныя з партыі складаюць 18-20 проц. усіх праверяных. Апрача таго, некаторая частка пераведзена ў кандыдаты і спачуваючыя.

Праверкомы, як правіла, ўдумліва і сур'ёзна адносяцца да ацэнкі таго ці іншага камуніста. Але ёсьць выключэньні. Праверком ячэйкі палітэхнікуму павархоўна падышоў да пасобных камуністаў... базуючыся галоўным чынам, на старых партспагнаньнях, не праверыўшы, як гэтыя камуністы выправілі свае памылкі, ці не паўтарылі іх, праверком проста выключаў з партыі. Нясур'ёзна гэты-ж праверком падышоў і да пераводу ў кандыдаты. Частка т. т., падаўшых апэляцыю, у гарадзкой камісіі па чыстцы здавальняюча адказвала на палітычныя пытаньні. Праверком не знайшоў ніякіх іншых матываў у сваё апраўданьне, як заявіць, што «таварышы, ідучы на гарадзкую камісію, добра падрыхтаваліся». Гэта сьведчыць аб нейкім экзамэнатарскім падыходзе праверкому да высьвятленьня ведаў праверяемага таварыша.

Гарадзкая камісія забракавала вывады праверкомаў ячэек палітэхнікуму і сацвыху, бо вывады насілі неканкрэтны, агульны характар. Для выпраўленьня ўказаных недахопаў была праведзена нарада ўсіх ячэйковых праверкомаў. Кожны член гарадзкой камісіі па чыстцы прымацован да групы ячэйковых камісій для штодзённага кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце.

Між іншым, некаторыя праверкомы зьбіваюцца з прынцыповай вышыні да такіх дэтапаў, якія могуць быць высьветлены і не на агульным сходзе. Напрыклад, праверком ячэйкі ЦРК адначасова загадчыка сталоўкі трымаў 1 пап. —2 гадзіны. Праўда, выступаючых па яго кандыдатуры было многа, але самыя выступленьні насілі характар абвальнага смакаваньня. Выступаўшыя апісвалі працэс атрыманьня загад чыкам талёнаў, матэрыял і нават такія дробязі, што ўзяты ім матар'ял быў «у цёмным кропельку»... Былі і такія факты, што пры справаздачы ячэйкі ўсе крытыка выступаючых накіроўвалася на адну асобу (эт'інстытут і кааптэхнікум—на дырэктара) і такім чынам змазваўся рад істотных недахопаў усяго калектыву, якія неабходна было ўскрыць. Праверкому ў такіх выпадках неабходна быць гібкім кіраўніком, накіроўваць спрэчкі, выступленьні ў неабходнае для партыі рэчышча, для карысьці справы.

Па ўсіх выяўленых недахопах у рабоце праверкомаў гарадзкой камісіяй прымаюцца меры і ячэйковыя камісіі выпраўляюць недахопы.

Першыя вынікі праверкі асобных парт'ячэек паказваюць, што выхаваўчая работа сярод малодых членаў партыі і, асабліва, кандыдатаў у віцебскай партарганізацыі не вялася. Факты, аб якіх пісала «Правда» пра «мёртвыя душы», ня толькі поўнасьцю пацьвярджаюцца, але ў значнай меры перавышаюць паказаныя лічбы. Ужо выяўлена не 800 «мёртвых душ», а тысячы паўтары. Становішча з членскімі ўзносамі проста пагражаючае. Парт'ячэйкі не займаліся гэтай справай, а гарадзкі камітэт КП(б)Б зусім не кантраляваў і не патрабаваў справаздачнасьці па членскіх узносах.

Вось, напрыклад, ячэйка ЛЕСАЗАВОДУ № 13. Ячэйковы праверком з 16 кандыдатаў партыі перавёў 11 чалавек у спачуваючыя, двух выключыў і толькі трох пакінуў у кандыдатах. Матывы пераводу і выключэньня—АДРЫЎ АД ПАРТ'ЯЧЭЙКІ, ПАЛІТНЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ І НЯЎПЛАТА ЧЛЕНСКІХ УЗНОСАЎ ПА ГОДУ І БОЛЬШ. Сапраўды выходзіць, што людзей прымалі ў партыю пад «туш», вербавалі іх, а пасьля прыёму ніхто не зьвяртаў на іх ніякай увагі. А сярод іх ёсьць добрыя пралетары, ударнікі, але яны ня былі ўцягнуты ў актыўную партработу.

З мэтай скарыстаньня тэй цягі да вучобы, якая назіраецца ў сувязі з чысткай партыі, гарадзкая камісія па чыстцы скінула нараду прапагандыстаў.

Чыстка радоў партыі выкрывае чужыя элемэнты, якія прапезьлі ў партыю, людзей з варожай ідэалёгіяй, дзяўрушнікаў і абываталяў з дробна-буржуазнай псыхалёгіяй. Так, праверкомам выключана па ячэйцы фабрыкі імя КЛАРЫ ЦЭТКІН нейкая МАЦЭВІЧ, якая да 1928 г. займалася гандлем і пасьля таго, як спыніла гандаль, уступіла ў партыю. Па ячэйцы ГАРБАРНІ выкрыт былы бандыт, які схаваўся ад пралетарскага суда і потым прапез у партыю.

Дырэктар падрабфаку БРОМ, член партыі, лічыць магчымым для сябе прымаць удзел у рэлігійных абрадах сваёй сям'і. Былая бундаўка КАРЭ (ячэйка ЦРК) гаворыць на чыстцы аб сваіх «рэвалюцыйных» бундаўскіх заслугах, а другая б. бундаўка ТАНХЕЛЬСОН ліквідуе, што яна належала да левага «рэвалюцыйнага» крыла Бунду і што контр-рэвалюцыйным лічыцца толькі правае крыло яго (?!). Ні Карэ, ні Танхельсон не паказалі сапраўднай рэакцыйнай сутнасьці бунду, не паказалі, што і правае і «левае» крыло бунду адыгрывалі здрадніцкую ролю ў рэвалюцыйным руху з мінулым не парвалі.

Неабходна адзначыць, што складзеныя ячэйкамі характарыстыкі часта не адпавядаюць таму, чым на справе зьяўляецца член партыі. Так, па ячэйцы біяфабрыкі адна камуністка атрымала характарыстыку, як ударніца і вытрыманая камуністка, а пры праверцы выявілася, што яна інжэўдарніца. У характарыстыцы т. ЗАЙЦАВАЙ (ф-ка Клары Цэткін) ня ўказана, што яна два гады была ў бундзе і як яна зжыла бундаўскую ідэалёгію.

Некаторыя характарыстыкі варты таго, каб іх зьмясьціць у «Крокодиле». Так, у тэй-жа ячэйцы біяфабрыкі каму ністу ШАПКО даецца такая характарыстыка: «ідэалёгічна ўстойлівы, за выключэньнем таго, што ён дробнабуржуазны сацыяліст»...

Як-жа гэта сумяшчаецца? З якога гэта часу мы дробна-буржуазных сацыялістаў пачалі акрэсьліваць, як ідэалёгічна-ўстойлівых камуністаў. Зразумела-ж, што член партыі з характарыстыкай «дробна-буржуазны сацыяліст» ня можа быць у радох нашай партыі.

Гарком КП(б)Б, выпучыўшы т. т. для складаньня характарыстык на ячэйкі, не пацікавіўся зьместам гэтых характарыстык, фармальна аднёсься да гэтай справы. На парт'ячэйку ГОЛКАВАЙ ФАБРЫКІ складзена такая палітычнапісьменная характарыстыка: «Яна добра змагалася з левым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе. Якімсьці чынам ня правы, а «левы» ўхіл у вёсьледвальнікаў голкавай фабрыкі стаў галоўнай небясьпекай на даным этапе.

**

Віцебская партарганізацыя ўступіла ў пэрыяд чысткі партыі з буйнейшымі прарывамі: ганебная зацяжка сяўбы, не выкананьне прамфінпляну радам прадпрыемстваў і інш. Падрыхтоўка да чысткі ня была выкарыстана для мабілізацыі мас на ліквідацыю прарываў, аб чым паведамлялася ўжо ў «Зьвязьдзе». Ня былі падабраны як сьлед кандыдатуры для праверачных ячэйкі вых камісій. З ліку выпучаных ГК і ГКК прышлося адабраць нязначную колькасьць, і для таго, каб навербаваць поўнасьцю праверкомы, прышлося пра верыць каля 100 чалавек. Гарадзкой камісіі па чыстцы самой прышлося арганізаваць у ячэйках прапрацоўку дакладу тав. КАГАНОВІЧА на маскоўкім актыве і тав. АНЦІПАВА на ўсебеларускім актыве. Зроблены былі даклады на зьлёце рабкораў, камсамолу, была праведзена шырокая нарада актыву (праверкомы, арганпартгрупы, кіраўнікі самаправерачных брыгад, сакратары парт'ячэек).

Першы тыдзень чысткі паказаў, што многія парткалектывы не ўспрынялі як сьлед дырэктывы партыі аб чыстцы, не разгарнулі шырокай масавай работы па пепшым выкананьні чарговых гаспадарчых задач (прамфінплян, прапопачная кампанія, падрыхтоўка да ўборачнай і г. д.). Гарадзкая камісія па чыстцы сумесна з гаркомам КП(б)Б правяла нараду сакратароў парт'ячэек па гэтым пытаньні.

Віцебскі гарком КП(б)Б прыняў пастанову і вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі ўдарных брыгад, датэрміновым выпуску некаторых відаў прадукцыі (датэрміновы выпуск з рамонту паравозаў, вагонаў, с.-г. машын і інш.). Даручана фракцыі гарпрафсавету правесьці на буйнейшых прадпрыемствах вытворчыя канфэрэнцыі па якасьці і зьніжэньні сабекошту.

У дапамогу вытворчым парткалектывам мабілізавана 60 чалавек актыву.

Чыстка партыі не павінна аспабіць ні на мінуту ўвагу да бягучых гаспадарчых задач. Неабходна ператварыць чыстку партыі ў магутны сродак лепшага выкананьня гэтых задач і грандыёзнага размаху сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

ВОПЫТ ПЕРШЫХ ДЗЁН ЧЫСТКІ

ПОЛАЦАК (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Чатыры ячэйковых камісіі па чыстцы партыі праверылі ўжо 8 парт'ячэек. Прайшло чыстку 99 камуністаў.

19 чэрвеня адбылася нарада ячэйковых камісій. Падагулены вынікі першых дзён работы.

Што выявілася?

У радзе ячэек падрыхтоўка да чысткі праведзена зусім дрэнна (ячэйка пессазоду, цагельні, камуны «Чырвоны артылерыст»). Асобныя камуністы трымаюць сябе на сходзе па чыстцы недыцыплінавана: прыдуць, пасядзяць, выйдуць (пессавод). Слабая актыўнасьць беспартыйных (цагельня). На чыстцы ячэйкі «Чырвоны артылерыст» выступала ў спрэчках па абгаварэньні кандыдатур паасобных таварышоў, якія праходзілі чыстку, ня больш двух-трох чалавек.

Райком партыі не забясьпечыў бальшавіцкай падрыхтоўкі да чысткі, асабліва ў напрамку растлумачэньня неабходнасьці разгорнутай самакрытыкі пры чыстцы. Толькі ў часе працы праверкому актыўнасьць партыйных і беспартыйных мас пачынае павялічвацца. Асаблівай увагі заслугоўвае той факт, што падрыхтоўка да чысткі ня была выкарыстана для ўзьнясьця палітычнага ўзроўню членаў і кандыдатаў партыі.

Першыя дні чысткі партыйнай арганізацыі Полачанчы паказалі, як своечасова і правільна вызначыла партыя гэта важнейшае мерапрыемства. Асобныя зьвеньні Полацкай партарганізацыі засьмечаны клясава-чужымі, варожымі элемэнтамі, перараджэнцамі і г. д.

Вось цагэльня. На чале яе доўгі час стаяў СІПЧАНКА. Зараз ён—начальнік будаўніцтва. Праграмы будаўнічых работ ня выконваюцца. Прамфінплян зрываецца.

Хто-ж такі Сіпчанка? З вялікай цяжкасьцю высьвятляе праверком твар гэтага чужака з партбілетам у кішэні.

— Хто твой цесьць? Маеш сувязь? —пытае камісія.

— Цесьць мой серадняк, але... з мёцных. Да 1929 году быў добры для савецкай улады, а ў 1929 годзе... выспан, як... кулак.

Нечакана для самога сябе Сіпчанка выдаў свой дзяўрушніцкі твар, свае сапраўдныя адносіны да ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектызіцыі. Ён выдаў, што па сутнасьці ня згодзен з раскулачваньнем кулака—цесьця, шкадуе яго.

— Маеш сувязь?—настойвае камісія.

—Не. Жонка мае. Ну, і я крыху меў,—прызнаецца нарэшце.

Сіпчанка сплаў з сакратаром парт'ячэйкі ПІРАГОМ. Кругавая парука. Сямейнасьць. Толькі пры актыўным удзеле ў спрэчках таварышоў КУЗЬНЯЦОВА І ГРЫНЬЛЯТА разьбіваецца замкнутае кола маўчаньня, узаемнага прыкрываньня прымазаўшыхся да партыі.

Пірог—тыповы прымірэнец. За прымірэнцтва ён быў выключан з партыі ў 1929 годзе. Потым уцёрся зноў. Зараз выключан разам з Сіпчанкам.

Прымазаньнікі да партыі ратуючы сябе, імкнуліся скампрамэтаваць вытры манага партыйца, 64-гадовага тав. ЛЕМЕША. Яму далі жахлівую характарыстыку: баляст, палітычна няпісьменны і г. д.

На чыстцы выявілася, што стары Лемеш палітычна добра падрыхтаваны. На ўсе пытаньні камісіі ён даў пазнаньня, простыя адказы. Рабочыя ў сваіх выступленьнях надзвычайна дадатна яго характарызавалі.

Праверком рэабілітаваў Лемеша.

З вялікім гонарам прайшоў чыстку машыніст тав. БАЗЗКА:

— Пачуе перад адходам з працы няправільны стук машыны—гэта яму не дае супакою дома, за абедам, ці за вячэрай. Прыйдзе ў ночы, капаецца, шукае прычыны, пакуль ня знойдзе. Пакуль не пачуе мерны, роўны ход машын — ня будзе адпачываць,—такія адносіны да працы ў камуніста Баззкі. Ён і палітычна вытрыманы, высока аўтарытэтны на заводзе.

Характэрны прыклад таго, што асобныя камуністы не працуюць над павышэньнем свайго палітычнага ўзроўню, можна прывесьці з ячэйкі кампасу «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ». Сюды прымацаваны два чыгуначнікі—ЧУРБАКОЎ І БАРАЎКОЎ.

Чурбакоў—дарожны майстра ст. Бараўха. Член партыі з 1919 году. Быў камісарам у часе грамадзянскай вайны. А зараз недапушчальна адстаў ад жыцьця.

Падыходзячы да стала камісіі, тав. Чурбакоў просіць:

— Ня пытайце мяне, калі паска, ні аб правых, ні аб «левых»,—нічагусенькі ня ведаю.

Тав. Чурбакоў ячэйковай камісіяй з членаў партыі пераведзен у кандыдаты.

Зусім іншы прыклад паказаў чыгуначнік, падпарадкаваны Чурбакову, арцельны стараста Бараўкоў: ён і на вытворчасьці першы, ён і палітычна добра пісьменны.

Нарада ячэйковых праверкомаў адзначыла, што ў асобных ячэйках пры праверцы палітведаў камуністаў, якія праходзілі чыстку, мелі месца каверзныя пытаньні. На сходзе парт'ячэйкі песазаводу з залі задаюць праверяемаму пытаньне:

— А ШТО БУДЗЕ ПРЫ КАМУНІЗЬМЕ?

Зусім правільна старшыня праверкому тав. Блюмкін растлумачыў, што на гэта пытаньне нельга адказаць проста, трэба цэлую лекцыю чытаць. Але і самжа т. Блюмкін няправільна зрабіў, задаўшы праверяемаму пытаньне:

— ЯКАЯ ДЫКТАТУРА БУДЗЕ ПРЫ КАМУНІЗЬМЕ?

Праўда, адказ на гэта пытаньне быў правільны:

— Ніякай. Дзяржава адамрэ.

Але такое пытаньне ня можа задавацца з мэтай выявіць палітычны ўзровень праверяемага таварыша. Яно можа толькі заблытаць.

Улічыўшы вопыт першых дзён, камісіі прыступілі да далейшай работы.

У культпропе ЦК КП(б)Б

Арганізацыя газэт пры палітаддзелах МТС

У ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) «аб рабоце палітаддзелаў МТС, аб калгаснай ячэйцы і ўзаемаадносінах райкомаў і палітаддзелаў» у першую чаргу арганізуюцца друкаваныя газэты пры наступных палітаддзелах МТС: ОЛУЦКАЙ, КАПЫЛЬСКАЙ, ФУЗЬДЗЕНСКАЙ, ПУХАВІЦКАЙ, ЦЯЛУШЫНСКАЙ, ПЛЕШЧАНІЦКАЙ ВЕТРЫНСКАЙ, ЛАГОЙСКАЙ, ЛЕПЕЛЬСКАЙ, СТАРОБІНСКАЙ, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКАЙ, ГАРАДОЦКАЙ, РАГАНОЎСКАЙ, ДЗЕМІДАЎСКАЙ (МАЗЫР), БАЛЬШАВІЦКАЙ (МЕНСК), ЛЕЛЬЧЫЦКАЙ, ДРЫСЕНСКАЙ, КЛІМАВІЦКАЙ, СЕНЬНЕНСКАЙ, ЛЁЗЬНЯНСКАЙ, І СІРОЦІНСКАЙ. У другую чаргу будуць арганізаваны друкаваныя газэты пры палітаддзелах МТС: ХОЙНІЦКАЙ, ПОЛАЦКАЙ, ЖЛОБІНСКАЙ, ОМАЛЯВІЦКАЙ, ГОРАЦКАЙ, АРШАНСКАЙ, ШКЛОЎСКАЙ І СТАРОБІНСКАЙ. Не першы час газэты будуць выходзіць адзін раз у пяць дзён.

Распрацавана пытаньне забясьпячэньня рэдакцый газэт палітаддзелаў МТС высокакваліфікаванымі работнікамі. Мабілізуецца 30 чалавек з ліку студэнтаў КІЖ'у, БДУ, рэдактароў фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, работнікаў цэнтральных і раённых газэт, а таксама з ліку былых газэтных работнікаў, якія зараз працуюць на іншых работах, для пастаяннай работы ў якасьці рэдактароў газэт палітаддзелаў МТС. Для адбору і мабілізацыі гэтай колькасьці работнікаў ЦК КП(б)Б выпучыў камісію ў складзе т. т. ЗЛОТКІНА, ПЫЖЫКАВА І КУРЦІКА. Гэтай камісіі дана права па сваім гледжаньні персональна адбіраць кандыдатуры рэдактароў газэт палітаддзелаў МТС, прычым пастановы камісіі зьяўляюцца канчатковымі і падлягаюць неадкладнаму выкананьню.

У ГОМЕЛЬ, ВІЦЕБСК, МАГІЛЕЎ, БАБРУЙСК і ВОРШУ накіраваны прад стаўнікі ЦК КП(б)Б для адбору кандыдатур на месцы.

Беспаліграфаб'яднаньне праводзіць дадатковую мабілізацыю ўнутраных паліграфічных рэсурсаў (у першую чаргу на прадпрыемствах паліграфаб'яднаньня), у прыватнасьці шляхам зьмяншэньня вытворчай магутнасьці больш буйных друкарняў з тым, каб забясьпечыць дадатковае стварэньне друкарняў у 12 раёнах БССР. (БЕЛТА).

Кожны раён БССР будзе мець друкарню

На сёньня яшчэ ня ўсе раёны БССР маюць друкарні. Зараз ідзе забясьпячэньне друкарскімі машынамі і шрыфтамі для стварэньня друкарняў у наступных раёнах БССР: ЛЮБАНЬСКІМ, КАРМЯНСКІМ, ЧАШНІЦКІМ, МСЬЦІСЛАЎСКІМ, РАСОНСКІМ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІМ і ДУБРОВЕНСКІМ. У раёны: ЛОЕЎСКІ, НАРАЎЛЯНСКІ, СУРАЖКІ, ГАРАДОЦКІ, БЕШАНКОВІЦКІ і ПАРЫЦКІ ўжо дастаўлены друкарскія машыны і ў бліжэйшыя 2 дзкады будуць дастаўлены шрыфты.

Зараз Культпропам ЦК КП(б)Б зьвернута асаблівая ўвага на справу арганізацыі на працягу бліжэйшых трох месяцаў яшчэ 12 раённых друкарняў. Такім чынам, будзе закончана арганізацыя друкарняў ў усіх бяз выключэньня раёнах БССР. (БЕЛТА).

Арганізован усебеларускі камуністычны газэтны тэхнікум

Усебеларускі газэтны тэхнікум, які знаходзіцца ў МАГІЛЕЎЕ, пастановай ЦК КП(б)Б рэарганізован ва ўсебеларускі камуністычны газэтны тэхнікум. У сувязі з гэтым вызначаны новыя правілы прыёму студэнтаў у тэхнікум.

Тэхнікум будзе рыхтаваць сярэдняе зьвяно работнікаў раённых газэт — загадчыкаў сэктароў, сакратароў. У канцы кэрвеня адбыўся чарговы выпуск 18 студэнтаў тэхнікуму, якія накіраваны на работу ў рэдакцыі раённых газэт. (БЕЛТА).

Выпуск студэнтаў 3 курсу КІЖ'у БССР

30 чэрвеня адбыўся выпуск студэнтаў 3 курсу Камуністычнага інстытуту журналістыкі БССР. Курс вучобы закончылі 9 таварышоў (некалькі студэнтаў было выпушчана датэрмінова).

З ліку выпускнікоў тры таварышы накіраваны для ўмацаваньня аддзелу пістоў рабочых і калгасьнікаў рэдакцыі газэты «ЗЬВЯЗДА», адзін таварыш у аддзел пістоў рабочых і калгасьнікаў рэдакцыі газэты «РАБОЧИЙ» і астатнія 5 таварышоў — у рэдакцыі раённых і палітаддзельскіх газэт. (БЕЛТА).

Узбекістан здае збожжа дзяржаве

НА ЗДЫМКУ: Караван з ячменем накіроўваецца да загатоўчага пункту

Уларадачыць будаўніцтва у пасёлку „Чырвоны электрык"

У пасёлку «Чырвоны электрык» у жніўні месяцы 1932 г. пачалося будаўніцтва 48 кватэр для рабочых Эльваду. Прашло ужо амаль каля году, а фактычна здалі ў эксплёатацыю адзін дом на 8 кватэр і толькі зараз заканчваецца другі дом.

Чым тлумачыцца такое ганебнае адставаньне? Менбуд поўнасьцю не забясьпечыў пабудовы патрэбнай рабочай сілай. На пасёлку «Чырвоны электрык» замест 50 рабочых працуюць 10-12. І гэтыя 10-12 чалавек не загружаны поўнасьцю працай на цэлы рабочы дзень, таму што транспарт не спраўляецца з падвозкай матар'ялаў. Транспарт—самы адстаючы вучастак у Менбудзе. Коні, дзякуючы дрэннаму корму і догляду, выконваюць нагрузкі толькі на 40 проц. Ня лепш стаіць справа з будаўніцтвам і ў Грушаўскім пасёлку. Тут у пачатку 1932 г. разгарнулася будаўніцтва 15 дамоў на 142 кватэры. Па пляну будаўніцтва павінна закончыцца ў жніўні месяцы г. г. Аднак, на сёпешні дзень здадзена ў эксплёатацыю толькі 12 дамоў. Пабудова астатніх дамоў вядзецца чарапашымі тэмпамі. Будаўніцтва забясьпечана рабочай сілай толькі на 40 проц. Замест штодзённай патрэбнасьці ў 150 рабочых, тут працуе толькі 60 чалавек.

Да гэтага часу на пабудовах Менбуду няма дакладнага ўліку сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Дрэнная арганізацыя працы, адставаньне транспарту, мітусьня ў кіраўніцтве—усё гэта тармозіць своечасовае выкананьне пляну будаўніцтва кватэрных памяшканьняў. Партыйны калектыў Менбуду павінен зьвярнуць максымум увагі на выпраўленьне ўсіх хібаў, якія перашкаджаюць пасьпяховаму ходу будаўніцтва. Вінаватых у зрыве будаўніцтва трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці. Шуб.

Наладзіць работу лягераў Асоавіяхіму

Для прахаджэньня вайсковай падрыхтоўкі асоавіяхімаўцаў, Менскі гарсавет АСО арганізаваў лягеры.

За час прабываньня ў лягерах кожны з прызваных павінен аўладаць ня толькі новымі вышынямі вайсковай тэхнікі, але і глыбока вывучыць і засвоіць пастановы пістарычнага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і рад іншых важнейшых пастаноў партыі і ўраду, каб вярнуўшыся на прадпрыемства, у калгас, вёску, ён змог мабілізаваць працоўныя масы на практычнае выкананьне іх.

Каб поўнасьцю ажыцьцявіць пастаўленыя перад лягерным зборам задачы, патрабуецца асабліва выразная работа саміх лягераў і яшчэ больш выразнае кіраўніцтва імі з боку партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый гор. Менску. Гарадзкі і цэнтральны саветы АСО павінны былі аддаць лягернаму збору максымум увагі.

Прайшло ўжо амат часу ад пачатку лягернага збору, але і да гэтага часу лягерам не аддаецца ніякай увагі. Культурнае абслугоўваньне лягераў (кіно, спэктаклі і інш.) — забыты вучастак. Праходзячыя лягерны збор не атрымліваюць нават газэт. Да сёпешняга дня яшчэ не адчынен у лягеры медпункт. Ня гледзячы на настойлівае патрабаваньне камсаставу лягераў, Чырвоны крыж і Менздраўаддзел ня прынялі ніякіх мер да яго арганізацыі.

Белкаапсаюз абавязаўся абслугоўваць лягеры ларкамі, але і яны не адчынены.

З прычыны адсутнасьці студні лягерыкі нават сырой вадой забясьпечваюцца з перабоямі. Бываюць выпадкі калі мы застаемся без вячэры. Работнікі кухні не спраўляюцца з ускладзенай на іх работай, з прычыны чаго заняткі часта зрываюцца.

Вучоба ў лягерах пастаўлена з рук вон дрэнна. Няма вучэбнага поля, няма належнай колькасьці падручнікаў і патрэбных вучэбных прылад. Па-за школьная работа зусім не праводзіцца.

Аб усіх гэтых пералядках добра ведае Цэнтральны савет Асоавіяхіму БССР, бо амаль кожны дзень у лягер прыяжджаюць яго працаўнікі (Дубіна, Кузьняцоў), але меры па паляпшэньню работы лягераў не прымаюцца.

Аспоўная віна за нездавальняючую работу лягераў пакае на Менскі гарсавет Асоавіяхіму, які не вравёў да лягернага збору амаль ніякай падрыхтоўчай работы.

Рабцэвіч.

З БАЛЬШАВІЦКАЙ ПРАМАТОЙ УСКРЫЦЬ ПАМЫЛКІ

Ліст таварыша **Сталіна** ў рэдакцыю **«Пролетарской революции»** паставіў перад партыяй, у прыватнасьці перад работнікамі гістарычнага фронту адказную задачу: «Падняць пытаньне гісторыі бальшавізму на належную вышыню, паставіць справу вывучэньня нашай партыі на навуковыя бальшавіцкія рэйкі і зазастрыць увагу супроць трацкісцкіх і ўсякіх іншых фальсыфікатараў гісторыі нашай партыі, сыстэматычна зрываючы іх маскі».

Гэта задача набывае асаблівае значэньне ва ўмовах Беларусі, дзе ў партарганізацыі ёсьць значная колькасьць выхадцаў з дробна-буржуазных і нацыянал-ліберальных партый, дзе пераважную масу членаў партыі складаюць малодыя кадры, пядаўна прынятыя ў партыю, дзе ў апошнія часы было нямала вылазак розных трацкісцкіх, нацыяналістычных і апартуністычных элемэнтаў. Таму задача мар сьцыцка-ленінскага выхаваньня малодых партыйных кадраў, **выхаваньня з гісторыі бальшавізму, на барацьбе бальшавізму супроць усіх відаў апартунізму на ўсіх этапах яго разьвіцьця, зазастрэньня бальшавіцкай пільнасьці членаў і кандыдатаў партыі** набывае вострае стаўпіца КП(б)Б.

Гэта ўлічваў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, калі ён даваў інстытуту гісторыі партыі важнейшыя даручэньні з выпуску навуковых работ і масавай марксыцка-ленінскай літаратуры. Гэтыя даручэньні ў асноўным зводзіць да наступнага:

1. Выданьне 12-цітомніка твораў Леніна, якое павінна быць падрыхтавана да выпуску ў 1932 годзе.

2. Скончыць ва ўдарным парадку падручнік па гісторыі КП(б)Б, як першачарговую навукова-палітычную задачу.

3. Падрыхтаваць да выданьня матар'ялы па гісторыі грамадзянскай вайны, гісторыі КП(б)Б і Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі.

4. Выдаць хрэстаматыю для шырокага партактыву па ленінскай нацыянальнай палітыцы і ажыцьцяўленьні яе ў БССР. Падрыхтаваць зборнік важнейшых пастаноў УсеКП(б) і КП(б)Б па нацыянальным пытаньні.

5. Выдаць хрэстаматыю па гісторыі Захаду.

6. У мэтах найбольш поўнага выкрыцьця нацдэмаўшчыны і ўрыўшчэнаўшчыны, эсэраўшчыны, бундызму і для ўзбраеньня ўзрастаючых кадраў бальшавіцка-распрацаваным матар'ялам, сакавіцкі пленум ЦК і ЦКК даручыў выдаць у бліжэйшыя месяцы рад праверяных, бальшавіцка-вытрыманых матар'ялаў.

Гэтыя даручэньні бюро і пленумаў ЦК складалі разгорнутую праграму работ для інстытуту гісторыі партыі ў 1932-1933 годзе. Як-жа справазлася кіраўніцтва і партарганізацыя інстытуту з выкананьнем гэтых адказных задач?

Інстытутам гісторыі партыі прароблена (галоўным чынам за апошні год) даволі значная навуковая работа па распрацоўцы дакумантаў па гісторыі КП(б)Б і грамадзянскай вайны і перакладу на беларускую мову твораў Уладзімера Ільліча Леніна. Рад работ падрыхтоўваецца да друку. Але ня гледзячы на ўсё гэта, трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што **інстытут гісторыі партыі не забясьпечыў сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў і якасьці работы, якіх патрабаваў Цэнтральны Камітэт;** партарганізацыя інстытуту не праявіла неабходнай настойлівасьці ў выкананьні сур'ёзных задач, ускладзеных на яе партыяй.

Праграма работ інстытуту, якую вышэй мы паказалі, ня выкавана інстытутам. Асабліва трэба спыніцца на выданьні 12-цітомніка твораў Леніна. 12-цітомнік павінен быў адыграць вялікую ролю ў барацьбе з усякімі спробамі фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму. Пакуль выданы толькі 4 тамы. Значная частка знаходзіцца ў друку, некаторыя тамы ў рэдактароў, а для рэшты яшчэ ня складзены прадмовы.

Аб буйных трацкісцка-мешшавіцкага характару памылках, якія ёсьць у прадмовах і заўвагах 3 і 5 тамоў, рэдагаваных Сэрбэнтай, ужо пісалася ў партыйным друку. Але нельга зноў ня ўспомніць, што ў 12-цітомніку твораў Леніна няма ніводнага артыкулу Леніна, накіраванага супроць Бунду. І гэта ў той час, калі для КП(б)Б асабліва вострай зьяўляецца задача барацьбы са спробамі ідэалізацыі Бунду, які зьяўляецца дробна-буржуазнай, нацыяналістычнай арганізацыяй. Няма ў 12-цітомніку і артыкулаў Леніна, накіраваных супроць эсэраў. Што зробіў інстытут, каб выправіць гэтыя памылкі? На гэта пытаньне павінна адказаць партарганізацыя інстытуту і кожны камуніст у паасобку ў часе чысткі ячэйкі.

Так стоіць справа з 12-цітомнікам. Ня лепш стаіць справа і з іншымі навуковымі работамі. За 1932 і 1933 год інстытут гісторыі партыі не даў **для партыйных мас ніводнага большменш буйнога твору.**

Кіраўніцтва інстытуту на чале з Сэрбэнтай, потым Сосновым і Гамарнікам замест бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю заданьняў Цэнтральнага Камітэту за выкананьне пляну займалося перараскладаньнем пляваў. Такіх пляноў з пачатку 1932 году было складзена ня менш 8. Выкананьне іх не забясьпечана правільнай расстаноўкай сіл і патрэбнай арганізацыяй работы. Наадварот, калі адзін плян зрываўся, людзі спакойна складалі другі плян, трэці і гэтай пляннатворчасьцю падмянялася сапраўдная барацьба за выпуск намечанай прадукцыі. **Партыйная ячэйка інстытуту толькі абгаварывала гэтыя пляны, але-ж не забясьпечвана іх выкананьне.**

Сярод асобных работнікаў інстытуту панавала дробна-буржуазная цалахлівасьць з выпускам прадукцыі (як-бы не нарабіць памылак). Сэрбэнта бясконца зацягваў рэдагаваньне твораў Леніна. Таксама недапушчальна доўга трымалася кіраўніцтвам інстытуту для прагляду і рэдагаваньня ўжо гатовая работа Ю. Майзэля па выданьні рэвалюцыі зьезду КП(б)Б. Гэта-ж боязьнь выпуску прадукцыі, жаданьне зьвяць з сябе адказнасьць прывяла да таго, што рэцэнзаваньне і рэдагаваньне работы т. Дудкова па разьвіцьці капіталізму на Беларусі было даручана ня досыць кваліфікаванаму работніку, у выніку чаго яна была здана ў друк з буйнымі палітычнымі памылкамі. Толькі потым у карэктуры яна была затрымана таварышам Поташам (які, да рэчы, і павінен быў адказваць за выпуск гэтай работы) для выпраўленьня.

У гістпарце, дзе ў свой час пад крылкам таварыша Сэрбэнта імкнуліся зьвіць сабе гняздо контр-рэвалюцыйныя трацкісцкія кантрабандысты Югаў і Рыўлін, павінна была быць асабліва завострана бальшавіцкая пільнасьць партыйнага калектыву.

Партарганізацыя выгнала з інстытуту трацкісцкіх кантрабандыстаў Рыўліна і Югава. Але гэтага мала. Ці зрабіла парт'ячэйка адпаведныя вывады з гістарычнага ліста тав. Сталіна? Гэта пытаньне зараз, у часе чысткі, мы павінны паставіць ва ўвесь упор.

За апошні час мы сустракаліся з радам кантрабандысцкіх, трацкісцкіх, нацдэмаўскіх і бундаўскіх вылазак. На справы Кернажыцкага і Чарняўскага калектыў інстытуту рэагаваў з вялікім спазьненьнем. **Парт'ячэйка не адыграла тэй вядучай ролі, якую яна павінна была адыграць у выкрыцьці гэтых клясава-варожых вылазак, а таксама ў выкрыцьці нацдэмаўскіх спраў у Наркамасьветы.** У інстытуце працавалі трацкісты **Іваноў і Гесэн.** Калі Іваноў выступаў з трацкісцкімі прамовамі, то ячэйка, ня гледзячы на выступленьні асобных яе членаў супроць гэтых трацкісцкіх кантрабандыстаў, ня здолела своечасова і да канца іх выкрыць і зрабіла гэта з вялікім спазьненьнем.

За работу Музэю Рэвалюцыі адказвае таксама партарганізацыя інстытуту. Што зрабіла ячэйка, каб папярэдзіць тыя памылкі, якія там былі? Ці выпадкова гэта здарылася, што на выстаўцы, якую наладзіў музэй па грамадзянскай вайне, не была адзнакаравана сапраўдная роля т. Сталіна. Затое быў партрэт Троцкага, ды яшчэ без усякіх камэнтараў. Праз гэту выстаўку член партыі Росіна правяла 700 гледачоў і толькі, калі выстаўка

Аб задачах УсеЦСПС і прафсаюзаў у сувязі з перадачай ім функцый Наркампрацы

Даклад т. ШВЭРНІКА на 3 пленуме УсеЦСПС 29 чэрвеня 1933 г.

I. Умацаваньне ролі прафсаюзаў, як масавых арганізацый рабочых у сацыялістычным будаўніцтве

Таварышы, зьліцьцё Наркампрацы з УсеЦСПС з перадачай функцый органаў Наркампрацы прафесыянальным саюзам зьяўляецца мерапрыемствам найвялікшага значэньня для ўсёй рабочай класы. Асноўнае значэньне гэтага рашэньня заключаецца ў тым, што ў сваім імкненьні ўзьняць матар'яльны дабрабыт рабочых наша партыя і ўрад перадаюць справу сацыяльнага страхаваньня, аховы працы, працоўнага заканадаўства цалкам і непасрэдна саюзам, гэтым найбольш масавым арганізацыям рабочых у нашай краіне.

Вам усім памятна тая барацьба, якую правялі прафсаюзы пад кіраўніцтвам партыі з правымі, паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці. У чым быў сэнс гэтай барацьбы? У тым, каб прафсаюзы ўключыліся ў актыўную барацьбу за індустрыялізацыю краіны, за перабудову сельскай гаспадаркі, за ліквідацыю капіталістычных класаў у нашай краіне. Правыя-ж апартуністы, як вы памятаеце, процідастаўлялі так званыя абарончыя функцыі прафсаюзаў вытворчым іх задачам, прабавалі процідаставіць прафрух партыі, процідаставіць дахавыя інтарэсы асобных груп рабочых інтарэсам рабочай класы ў цэлым.

Выходзячы ў сваёй барацьбе супроць лініі партыі з меншавіцкіх, трацкіцкіх пазыцый, правыя апартуністы ў прафсаюзах ігнаравалі актыўнасьць рабочых мас на выкананьне задач рэканструкцыйнага перыяду. Яны прабавалі зрываць энтузіязм і разгортваючуюся ініцыятыву шырокіх мас рабочых і сталі перашкодаю на шляху рабочай класы на разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў нашай краіне, а, значыць, і карэннага зьмяненьня матэрыяльнай і форм працы.

Калі-б прафсаюзы пайшлі на шляху правых, яны адарваліся-б ад мас, яны-б загубілі сябе, як масавыя арганізацыі рабочых.

Прафсаюзы мабілізавалі сілы, энэргію мільёнаў рабочых на стварэньне і ўмацаваньне сацыялістычных прадпрыемстваў, стварэньне новай тэхнікі і забесьпячэньне набудовы ў першай пяцігодцы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Разбуйненьне прафсаюзаў, праведзенае па ініцыятыве ЦК партыі і тав. **Сталіна**, дало магчымасьць перабудаваць рады прафсаюзаў, перабудаваць так, каб прафсаюзы маглі ажыцьцяўляць канкрэтнае кіраўніцтва вытворчай актыўнасьцю рабочых мас адпаведных галін прамысловасьці, каб прафсаюзы ближэй ведалі спэцыфічныя ўмовы работы гэтых мас і на гэтай аснове змаглі-б лепш абслугоўваць матэрыяльныя і культурныя запатрабаваньні і патрэбнасьці рабочых. У нас было 23 прафсаюзы, а сёньня мы маем ужо 47 саюзаў. Мы прынялі таксама важнейшае рашэньне аб карэннай рэарганізацыі сацыяльнага страхаваньня, гэтай важнейшай справы забесьпячэньня рабочых нашай краіны.

У пленум падкрэсьлівае необходнасьць выбраньня прафсаюзамі органаў сацыяльнага страхаваньня і зацьвярджэньня бюджэтаў сацыяльнага страхаваньня прафсаюзнымі арганізацыямі. Прафсаюзы, такім чынам, непасрэдна прымаюць удзел у разьмеркаваньні сродкаў сацстраху, разьбіраюцца ў тым, куды гэтыя сродкі накіроўваюцца.

IX зьезд прафсаюзаў ашчэ больш рэзка падкрэсьліў задачы прафсаюзаў па абслугоўваньні матэрыяльных і культурных патрэб і запросаў рабочых.

У сваім выступленьні на зьезьдзе тав. **Кагановіч гаварыў:** «Прафработнікі павінны дабіцца такога становішча, каб рабочы са сваімі патрэбамі і запросамі ішоў у першую чаргу ў свой саюз. Гэта можна ажыцьцявіць не дэкретам, не рэзалюцыяй аб асобных «правох», а практычнай работай, тым, што рабочыя на практыцы ўбачаць, што саюз уважліў да іх запросаў і ўмее дабівацца задавальненьня справядлівых патрабаваньняў і просьбаў».

Тав. Кагановіч падкрэсьліваў, што задачай прафсаюзаў зьяўляецца ўвязваць «канкрэтныя патрэбы рабочых з інтарэсамі сацыялістычнай прамысловасьці».

IX зьезд на падставе ўказаньняў тав. Кагановіча падкрэсьліў, што лёзунг «тварам да вытворчасьці» патрабуе самых уважлівых, самых клапатлівых адносін прафарганізацыі да рабочых, іх канкрэтных патрэб і запросаў. З часу IX-га зьезду работа прафсаюзаў па ўсебаковым абслугоўваньні рабочых і, у прыватнасьці, у галіне сацыяльнага страхаваньня і аховы працы значна ўзмацнілася.

Чым выклікана зьліцьцё органаў Наркампрацы з УсеЦСПС?

Перш за ўсё рост народнай гаспадаркі, які прывёў да ліквідацыі беспрацоўя, іншыя паставілі пытаньне аб наборы рабочай сілы. «Абстаноўка—гаварыў тав. **Сталін** у сваіх 6 гістарычных умовах—цяпер змянілася ў корані. З гэтага выцякае,—гаворыць далей тав. **Сталін**,—што нельга больш разьбіваць на самацёк рабочай сілы. Значыць, ад «палітыкі» самацёку трэба перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочых для прамысловасьці».

Усё гэта разам узятае азначае, што адпалі функцыі Наркампрацы па рэгуляваньні рынку працы і разьмеркаваньні рабочай сілы..

Калі мы возьмем галіну заработнай платы, дык пераканаемся таксама ў тым, што і тут адбыліся карэнныя зьмены, якія адбіліся на рабоце органаў Наркампрацы. Што мы маем у галіне сацыяльнага страхаваньня і аховы працы?

Рост народнай гаспадаркі, рост рабочай класы прывялі да вялізарнага павялічэньня фондаў сацыяльнага страхаваньня і патрабавані карэннай перабудовы ўсёй справы сацыяльнага страхаваньня тварам да вытворчасьці. Гэтай задачы органы НКП ня выканалі.

Вывад, да якога прыводзіць нас вопыт мінулых гадоў, заключаецца ў тым, што рашэньне аб зьліцьці Наркампрацы і органаў сацыяльнага страхаваньня з УсеЦСПС мае вялізарнае палітычнае і практычнае значэньне і выцякае з узросшай ролі прафсаюзаў у сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны.

II. За ўсебаковае абслугоўваньне матэрыяльна-бытавых патрэб рабочых мас

У нас і ў іх

Якія матэрыяльныя сродкі атрымліваюць прафсаюзы па лініі сацыяльнага страхаваньня ў сувязі з ліквідацыяй Наркампрацы? Бюджэт сацыяльнага страхаваньня на 1933 г. вызначаецца ў суме 4.431.000.000 руб., у той-жа час увесь дзяржаўны бюджэт Польшчы складае 510 млн. руб., Латвіі—48,8 млн. руб., Румыніі—279,2 млн. руб., Італіі—1.870 млн. руб.

Як бачыце, прафсаюзы атрымліваюць вялізарныя сродкі, прызначаныя для сацыяльнага страхаваньня, сродкі на многа большыя, чым увесь дзяржаўны бюджэт названых мною капіталістычных дзяржаў, усіх разам узятых.

Пры ўсім гэтым расходы па сацыяльным страхаваньні рабочых у нашай краіне будуць няўхільна ўзрастаць. Зарукай гэтаму—рост нашай гаспадаркі; зарукай гэтаму—савецкая ўлада, для якой найпершым абавязкам зьяўляюцца клопаты аб рабочых і працоўных.

Далёка ня так стаіць справа заграніцай, у капіталістычных краінах. Там адбываецца адваротнае. Там, ня гледзячы на тое, што зараз штодзённа выкідваюцца на вулицу дзесяткі і сотні тысяч рабочых, беспрацоўныя абдзяляюцца дапамогі і г. д. Напрыклад, у Чэхаславакіі агульны фонд сацыяльнага страхаваньня, ня гледзячы на рост беспрацоўя, у дзяржаўным бюджэце на 1933 г. зьнижан на 196 млн. чэскіх крон. Памер дапамогі скарачаецца з 18 да 12 чэскіх крон. Зьнижаюцца больничныя дапамогі на 50 проц., што азначае зьмяншэньне агульнага фонду сацыяльнага страхаваньня на 65 млн. чэскіх крон. Павялічваецца таксама чакальны перыяд ад 2 да 3 дзён, г. зн. хворыя атрымліваюць дапамогу па хваробе толькі з 4-га дня хваробы. Там-жа уводзіцца і прымусовая праца ў апла ту за прадастаўленьне дапамогі па бацстраху.

У Германіі фашысты павялі шалёнае наступленьне на рэшткі сацыяльных заваяваньняў рабочай класы. Асноўная мэта фашызму ў гэтых адносінах—ліквідаваць сацыяльнае страхаваньне, і гэта адкрыта выказаў кіруючы орган саюзу нямецкіх прадпрыемцаў «Фюрэфрыфэ» пасьля прыходу Гітлера да ўлады.

«Набыўшы вялізарныя памеры рост сацыяльнага страхаваньня,—гаворыцца ў гэтым органе,—павінен быць энэргічна ўрэзан, каб не культываваць люмпэн-пралетарыят». — вось як ставіцца пытаньне фашыстамі. Аказваць дапамогу рабочаму—гэта значыць «культываваць люмпэн-пралетарыят». Проч дзяржаўную дапамогу, проч сацыяльнае страхаваньне—такая праграма фашызму, і аб гэтым мы павінны расказаць рабочым.

Таварышы! У той час, калі ў Савецкім саюзе функцыі прафесыянальных саюзаў па абслугоўваньні рабочых надзвычай расшыраюцца, прафсаюзам перадаюцца вялізарныя сродкі,—у капіталістычных краінах, у прафсаюзаў нават угодніцкіх рэфармісцкіх адбіраюцца ўсе рэшткі ранейшай іх сілы і ўплыву, якіх рабочая класа дабілася за доўгія гады палітычнай і эканамічнай барацьбы з буржуазіяй.

Мы можам сказаць усім рабочым капіталістычных краін, што мы ня толькі аднавілі разбураную грамадзянскай і імпэрыялістычнай вайной гаспадарку, але мы выканалі пяцігодку за чатыры гады. Мы пабудавалі новыя гіганты, пабудавалі новыя галіны прамысловасьці на новай тэхнічнай базе і зараз пачынаем авалодваць гэтай тэхнікай. Уся наша барацьба—доказ таго, што рабочая класа, узяўшы ўладу, фабрыкі і заводы ў свае рукі, можа пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будаваць сацыялізм і кіраваць прадпрыемствамі бяз усякіх капіталістаў (апладысмэнты).

Падыходзіць да справы як сапраўдныя гаспадары

Таварышы, мы становімся сапраўднымі гаспадарамі сацыяльнага страхаваньня, і гэта ўскладае на нас, як я ўжо сказаў, таксама вялізарныя абавязкі і адказнасьць. Дрэнна будзем працаваць, рабочы нам па шчыдасьць. Рабочыя будуць гаварыць: «Прафсаюзы гэтым займаюцца, яны дрэнна працуюць і таму дрэнна». Нам трэба паставіць гэту справу на належную вышыню, а гэта значыць — у дасканаласьці ўладаць ёю, канкрэтна і ясна ўяўляць сабе новыя функцыі; гэта значыць на справе весьці ўсю гэту работу, апіраючыся на ініцыятыву рабочыя масы з актыўнай дапамогай гэтых мас. Я не сумняваюся ў тым, што мы з гэтаю справаю справімся. Гэта нясумненна.

У распараджэньні органаў сацстраху ёсьць 311 даёў адпачынку з лікам ложкаў на 73 тысячы чалавек, 98 санаторый, у тым ліку і ў курортных мясцовасьцях, з лікам ложкаў на 19.925 чалавек. Кошт даёў адпачынку і санаторый, уключаючы і абсталяваньне, перавышае 150 млн. руб. Пропускная здольнасьць у даёў адпачынку—1.140 тысяч чал. пры двухтыднёвым водпуску. Па санаторах пропускная здольнасьць ны месячным водпуску—141.330 чалавек.

Бачыце, які вялізарны лік людзей павінен быць у 1933 г. прафсаюзамі накіраваны у даёў адпачынку і на курорты. Ны гэтым уцячэце, што гэта гаспадарка ашчэ для органаў сацстраху зьяўляецца новаю. Гэтай справе толькі другі год, так што перад прафсаюзамі вялікія перспэктывы ў справе падвядзеньня ўласнай харчовай базы для даёў адпачынку і санаторый.

Уся гэта буйнейшая гаспадарка патрабуе ад прафсаюзаў вылучэньня такіх таварышоў, якія-б маглі адносіцца з усёй бальшавіцкай і рабочай добрасумленнасьцю да гэтай гаспадаркі.

Усе перавагі—ударнікам і кадравым рабочым

Мы павінны ператварыць справу сацыяльнага страхаваньня сапраўды ў магутны вагар палепшэньня матэрыяльнага становішча рабочых і ўсяму прадукцыйнасьці працы.

Трэба выкараніць усякі бюракратызм і ўраўнілаўку ў сацыяльным страхаваньні. Пераглядзець усю практыку сацыяльнага страхаваньня з пункту погляду пераважнага снабжэньня ўдарнікаў і старых кадравых рабочых. На першы плян павінна быць пастаўлена барацьба з цякучасьцю рабочай сілы.

Абараняючы інтарэсы рабочай класы і сацыялістычнай прамысловасьці, ня можам мы больш цярпець такога становішча, калі лягун і прагул пічык часамі забясьпечваюцца пэрэўвагі з перадавым рабочым, ударнікам. Мы павінны ў мэтах заахвочаньня ўдарніцтва і сацспаборніцтва ўнесьці зьмены ў існуючае заканадаўства па сацыяльным страхаваньні, па забесьпячэньні рабочых па часовай непрацаздольнасьці, пэнсіях і г. д. Вось гэта будзе рабочы, гаспадарчы падыход да справы.

У галіне аховы працы

У мэтах лепшай пастаноўкі аховы працы і тэхніцы бясьпечнасьці, больш канкрэтнага кіраўніцтва гэтаю справаю, трэба перадаць інспэкцыю па аховe працы, тэхніцы бясьпечнасьці і прамсанітарыі ЦК саюзаў і на мясцох — фабрычна - заводзкім камітэтам. УсеЦСПС павінен ажыцьцяўляць агульнае кіраўніцтва аховай працы і тэхнікай бясьпечнасьці, а таксама распрацоўку агульнага заканадаўства па аховe працы і тэхніцы бясьпечнасьці, зацьвярджэньне норм спэцвопратки, спэцабутку і спэцхарчаваньня, устанаўленьне правіл, рэгулюючых рабочы час і адпачынак, распрацоўку правіл і норм па тэхніцы бясьпечнасьці. Фонды аховы працы знаходзяцца ў распараджэньні гаспадарчых органаў, імі расходуюцца на адпаведныя мерапрыемствы, якія вызначаюцца на згодзе з прафорганамі.

Кіраўніцтва грамадзкімі інспэктарамі па аховe працы неабходна ўскладаць на фабзаўкомы. Трэба, каб справаю аховы працы пачыньна займаліся самі ЦК саюзаў і фабрычна-заводзкія камітэты на мясцох. Гэта неабходна таму, што нельга зараз гаварыць аб аховe працы «наогул», а трэба гаварыць аб аховe працы канкрэтна.

Трэба ведаць ахову працы, трэба ведаць, што рабіць, трэба ведаць добра даную галіну прамысловасьці, трэба ведаць прадпрыемства, трэба ведаць думку рабочых, прыслухоўвацца да іх парад.

Мы можам і павінны ўпарадачыць справу аховы працы і скарыстаць тыя значныя рэсурсы, якія даюцца дзяржаваю на ахову працы так, каб гэта ішло на карысьць рабочаму, каб рабочы мог бачыць клопаты прафсаюзу аб сабе.

Якія-ж асноўныя арганізацыйныя мерапрыемствы выцякаюць з перадачы справы сацыяльнага страхаваньня прафсаюзам?

Я думаю, што асноўным зьяўляецца перабудова справы сацыяльнага страхаваньня на галіннаму вытворчаму прынцыпу. Перш за ўсё нам трэба ліквідаваць тэрытарыяльныя, абласныя, раённыя страхавыя касы з перадачай усіх іх функцый непасрэдна прафсаюзам. Цяпер нам трэба мець такія касы, якія-б былі непасрэдна вызваны з вытворчасьцю, непасрэдна абслугоўвалі-б тую ці іншую галіну прамысловасьці, тую ці іншую групу рабочых.

Улічваючы вопыт работы галінных кас у 11 галінах прамысловасьці, трэба стварыць такія касы пры ўсіх ЦК саюзаў.

Далей неабходна скасаваць усесаюзны цэнтральны савет сацыяльнага страхаваньня і перадаць яго функцыі УсеЦСПС.

Усе санаторы і дамы адпачынку сацстраху, якія маюць мясцовае значэньне, разам з дапаможнымі гаспадаркамі трэба перадаць у веданьне краявых і абласных саўпрофаў.

Курорты, санаторы і дамы адпачынку сацстраху, якія маюць агульнасаюзнае значэньне, павінны быць перададзены ў веданьне УсеЦСПС.

III. Яшчэ бліжэй да мас

Рашэньне аб зьліцьці Наркампрацы і яго органаў з УсеЦСПС і перадачы яго функцый прафсаюзам, дае ў рукі прафсаюзаў магутны сродак у барацьбе за палепшэньне матэрыяльнага становішча і бытавых умоў жыцьця рабочых і за ўздым прадукцыйнасьці працы.

Але разам з тым узмацняецца і адказнасьць прафсаюзаў. Цяпер спра ва сацстраху цалкам і поўнасьцю ў нашых руках і мы адказваем за яе. Мы будзем адказны і перад рабочымі, і перад дзяржавай за гэту справу. Гэта трэба нам цьвёрда запомніць. Для таго, каб ажыцьцявіць гэта рашэньне, нам прадстаіць поўная, як я ўжо сказаў, перабудова работы між саюзных і саюзных арганізацый. Я маю на ўвазе ня толькі няўхільную перабудову апарату УсеЦСПС, міжсаюзных і саюзных органаў, выпрацоўку адпаведных палажэньняў і інструкцый і г. д.; гэта трэба зрабіць у найкарацейшы тэрмін, бо работа ня будзе чакаць, пакуль мы разварушымся; справу трэба прыняць на-ходу. Але гэтага мала. Гаворачы аб перабудове, я маю на ўвазе таксама карэннае ўзмацненьне ўсёй нашай прафсаюзнай работы. Мы павінны ўзмацніць уцягненьне самых шырокіх мас рабочых і служачых у актыўную работу прафсаюзных арганізацый. Апарат УсеЦСПС, міжсаюзных і саюзных арганізацый павінен мець вакол сябе шырокі актыў дабраахвотнікаў, вывязаных з намі ў штодзённай рабоце. Мы павінны ўсю сваю работу пабудаваць на аснове самага чулага прыслухоўваньня да патрэб і запраў рабочых.

Канчаючы, я ўпэўнен, таварышы, што кожны з вас, кожны работнік прафсаюзу, кожны рабочы і работніца адкажуць на рашэньне партыі і ўраду аб выліцьці народнага камісарыяту працы з УсеЦСПС удзесяцярнай работай па сацыялістычным будаўніцтве і ўсебаковым абслугоўваньні патрэб і запросаў найшырэйшых мас рабочых і працоўных нашай краіны. (Бурныя апладысмэнты).

Загад па Народным Камісарыяце Збожжавых і Жывёлагадоўчых саўгасаў СССР ад 2 ліпеня 1933 г.

Спрыяючыя ўмовы падвор'я, лепшая апрацоўка і сяўба супроць мінулага году даюць магчымасьць саўгасам атрымаць у гэтым годзе ураджай значна вышэйшы, чым гэта прадугледжана зацьверджанымі плянамі.

Ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні СНК Саюзу ССР, ЦК УсеКП(б) і распараджэньні Наркамсаўгасаў аб тым, што ўся прадукцыя саўгасаў належыць толькі дзяржаве і найпершым абавязкам саўгасаў, трэстаў і ўпаўнаркамсаўгасаў зьяўляецца здача дзяржаве ўсёй таварнай прадукцыі, раськ ладзьлі лапцюм дзеяньняў Адэскага збожжатрэсту ўстаноўлена, што кіраўніцтва збожжатрэсту займалася сьвядомым ашуканьнем дзяржавы, значына перапамяшаючы ўраджайнасьць саўгасных палёў, складаючы фальшывыя данныя аб быццам магнуўшых азімых пасевах і гэтым падрывала плян здачы збожжа дзяржаве.

Паводле вестак, якія ёсьць у Наркамсаўгасах, некаторыя іншыя трэсты і саўгасы таксама перапамяшчаюць фактычную ўраджайнасьць, на толькі не прадугледжваюць здачу дзяржаве ўсёй без выключэньня таварнай прадукцыі, але пазасобныя работнікі саўгасаў, трэстаў, упаўнаркамсаўгасаў і нават апарату Наркамсаўгасаў праяўляюць яўна антыдзяржаўныя, буржуазна-перараджэнцкія тэндэнцыі, якія выяўляюцца ў імкненьні скрыць фактычную ўраджайнасьць і сарваць здачу дзяржаве ўсёй без выключэньня таварнай прадукцыі.

Загадваю:

1. Пад асабістую адказнасьць дырэктароў саўгасаў, дырэктароў трэстаў і упаўнаркамсаўгасаў безагаворачна здаць дзяржаве ўсю без выключэньня таварную прадукцыю.

2. Дырэктарам трэстаў і саўгасаў узяць пад асабісты нагляд справу аднаўленьня ўраджайнасьці саўгасаў і ні ў якім выпадку не перадаручаць гэтай справы іншым работнікам саўгасаў і трэстаў.

3. Папярэдзіць дырэктароў саўгасаў і трэстаў, упаўнаркамсаўгасаў і работнікаў апарату Наркамсаўгасаў, што пры выяўленьні спроб утойваньня ад дзяржавы таварнай прадукцыі, хоць бы яна і засталася вышэй данага ім пляну, да работнікаў саўгасаў, трэстаў, упаўнаркамсаўгасаў і Наркамату будуць ужыты суровыя меры спагнаньня як да ашуканцаў дзяржавы і раскрадальнікаў грамадзкай уласнасьці, за што панесьлі ўжо і ашчэ панясуць заслужаную кару кіраўнікі Адэскага збожжатрэсту.

Наркамсаўгасаў СССР — Юркін.

У тэрмін убраць ураджай і здаць збожжа дзяржаве

Пастанова зьлету брыгадзіраў і ударнікаў перадавых калгасаў Слуцкага раёну

Калгасы Слуцкага раёну пад кіраўніцтвам партарганізацыі, першымі ў БССР выканалі плян веснавой сяўбы, заваявалі першынство ў спаборніцтве з калгасамі Бабруйскага раёну і Заходняй вобласьці.

Замацаваць першыя посьпехі барацьбы за ўраджай клапатлівым доглядам пасеваў, вучыцца іх ад пустаезьля, падрыхтоўкай да ўборкі, выкананьнем абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай—вось на што пераключылася перадавыя калгасы Слуцкага раёну адразу пасьля сяўбы.

Аднак, зьлёт адзначае, што цяперашні год праполачнай, папаравай, сенаўборкі і падрыхтоўкі да ўборачнай на раёне зьяўляецца нездавальняючым. Зьлёт абавязваецца ў першую чаргу сам і заклікае ўсіх калгасьнікаў мабілізаваць усе свае сілы, усю сваю энэргію і, ня трацячы ні аднаго дня, пабальшавіцку ўзьняць якасьць і тэмпы праполкі, ворыва папару, разгортваньня сенаўборачнай і падрыхтоўкі да ўборкі.

Ажыцьцяўленьне лёзунгу першага зьлёту ўдарнікаў калгасьнікаў Слуцчыны—даць па сацыялістычных палёх, Слуцчыны **РЭКОРДНЫ УРАДЖАЙ** у БССР—патрабуе ад кожнага калгасу нашага раёну, ад кожнага калгасьніка-ўдарніка сапраўды ўзорнага ажыцьцяўленьня ўсіх указаньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб праполцы, ворыве папару і арганізацыі ўборкі збожжавых, няпрымірнай барацьбы супроць усякіх спроб сабатажу гэтых дырэктыў.

Зьлёт ухваляе ініцыятыву ўдарнікаў Татарскай рэспублікі і Дняпропятроўшчыны аб арганізацыі ўсесаюзнага спаборніцтва на першынства ва ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве.

Гонар сьцяганосцаў ударных тэмпаў і якасьці, даны нашаму раёну чырвоным сьцягам, ЦК і СНК, абавязвае ўсіх калгасьнікаў-ударнікаў Слуцчыны забясьпечыць пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі найлепшае правядзеньне ўборачнай і датэрміновае выкананьне абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, якая забясьпечыла будаўніцтва калгаснага заможнага жыцьця, волькага ад кулацкай кабалы.

Зьлёт узгадвае калгасьнікаў Слуцчыны ўключэцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі і датэрміновае выкананьне на пастаўцы збожжа дзяржаве.

Зьлёт абавязваецца:

— Правесьці паўторную праполку збожжавых і ў абавязковым парадку падвойна-патройную праполку гародных і прапашных культур, выпучыўшы ў кожнай брыгадзе дазорную ўраджаю, арганізаваўшы аховy пасеваў ад патравы і кулацка-шкодніцкіх элемэнтаў.

— Да 25 чэрвеня поўнасьцю скончыць ворыва чыстага папару, арганізаваўшы, як правіла, падвойна-патройнае баранаваньне. Зараз-жа арганізаваць у кожнай брыгадзе гноянакапленьне з тым, каб плян угнаеньня пад пасевы азімых быў перавыкананы.

— Забясьпечыць абавязковае зьяўленьне двух укосаў з заліўных і забалочаных сенажацяй і сеяных траў, для чаго неадкладна рэзка ўзьняць тэмпы разгортваньня МАСАВАЙ сенаўборкі, шырока ўжываючы, як і перадавыя калгасы Серадзякоўскага, Серагоўскага і іншых сельсаветаў, практыку веснавой сяўбы—капаньне і расчыстку каналаў для спуску вады і паскарэньне сенаўборкі і не якасьці в тым, каб сенаўборку правесьці на працягу 14 дзён.

— Поўнасьцю выканаць плян сілосаваньня ў кожным калгасе, для чаго неадкладна разгарнуць праверку падрыхтоўкі сіласных ям і вежаў.

Уборку жыта правесьці на працягу 10 дзён, аўса—12 дзён, ячменю—8 дзён, ільну—12 дзён, уборку і перавораньне бульбы—15 дзён, пачынаць уборку, не чакаючы агульнага пасьпяваньня, а па меры пасьпяваньня вучыстаў, хоць гэта быў бы і адзін гэктар.

— Уборку машынамі праводзіць выключна з зерняўлоўнікамі, ужываючы абавязковае падграбаньне калосьсяў, не дапускаючы ні аднаго зерня страт. Устанавіць, як правіла, што зжатае збожжа павінна быць у той-жа дзень павязана ў снапы і закапнавана.

— Не дапускаць перастойваньня збожжа ў копнах, арганізаўючы звозку ў гумны не пазьней, чым праз 5-6 дзён пасьля пачатку жніва. Для звозкі ўжываць калёсы толькі абшытыя фанэрай або палатном, не дапускаючы ўцечкі зерня.

— Устанавіць пільны ўлік усяго зжатага збожжа як на полі, так і ў часе прыёмкі ў гумны, выключаючы лепшых ударнікаў адкаданымі за прыёмку і ўкладку збожжа. Выпучыць адначасова ў кожным калгасе поўнае месца ў гумне для сушкі махоркі. МТС 1 райза правесьці кароткатэрміновыя курсы вагаўшчыкоў.

— Наладзіць у кожнай брыгадзе пільную аховy ўраджаю, устанавіўшы кругласутачную аховy зжатага збожжа спэцыянальнымі дзяжурнымі.

— Устанавіць у кожнай брыгадзе штодзённы бракераж і кантроль за якасьцю работы, выпучыўшы ў кожнай брыгадзе грамадзкага інспэктара РСІ па якасьці.

— Арганізаваць у кожным калгасе грамадзкае харчаваньне непасрэдна на палёх і бесьперапынную работу дзіцячых ясьлей.

— Сяўбу азімых распачаць з 15 жніўня і завяршыць яе да 10 верасьня, для чаго ў першую чаргу выдзеліць уборку тых вучасткаў, на якіх будзе рабіцца пасеў азімых.

— Зьлёт асабліва адзначае, што задача акуратнага выкананьня абавязкаў па збожжаздачы дзяржаве, паводле закону аб пастаўцы збожжа, зьяўляецца першачарговай і галоўнай задачай кожнага калгасу і калгасьніка. Без своячасовага выкананьня абавязкаў перад дзяржавай ня можа быць сапраўднага ўмацаваньня калгасаў, ня можа быць заможнага калгаснага жыцьця. Першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай, — гэта справа гонару кожнага калгасу, кожнага калгасьніка.

— Зьлёт ударнікаў-калгасьнікаў ад імя ўсіх калгасаў Слуцкага раёну бярэ на сябе абавязак узяць першае месца па ў БССР па выкананьні абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, поўнасьцю выканаць заданьне па пастаўцы збожжа дзяржаве да 1 верасьня. У мэтах ажыцьцяўленьня гэтай ганаровай задачы і апіраючыся на ініцыятыву перадавых калгасаў, зьлёт лічыць необходным у кожным калгасе:

а) устанавіць для кожнай брыгады апрацыйны плян пастаўкі збожжа дзяржаве, вылучыўшы ў брыгадах спэцыяльныя зьвяньні для возкі збожжа на прыёмныя пункты, не адрываючы іх на іншыя работы да поўнага выкананьня заданьня;

б) абмалот пачынаць не пазьней, чым праз 5-6 дзён пасьля пачатку жніва, і здачу збожжа дзяржаве пачаць з першага-ж абмалоту, адразу-ж ад мала тарні;

в) своячасова падрыхтаваць патрэбную колькасьць тары, мабілізаваўшы ўсе ўнутраныя рэсурсы. На працягу дэкады правесьці рамонт мехатары. Шырока разгарнуць ініцыятыву выкарыстаньня бястарнай перавозкі (скрыні і 1 інш.), своячасова падрыхтаваўшы гэту справу. Адным словам, павінны быць прыняты ўсе меры, каб ня было ніякіх затрыманьняў у збожжаздачы з-за адсутнасьці або недахватаў тары;

г) неадкладна ўзяць на ўлік усю наяўную колькасьць сьвірнаў, вызначыць лепшыя з іх для ссыпкі калгаснага збожжа, своячасова арганізаваўшы рамонт і дэзынфекцыю іх з тым, каб не дапусьціць псаваньня зерня ў сьвірнах;

д) устанавіць абавязковае ўзважваньне збожжа як пры выхадзе з малатарні, так і пры прыёмцы ў сьвірны.

Зьлёт ударнікаў-калгасьнікаў Случчыны выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшым правядзеньні ўборачнай і датэрміновым выкананьні абавязкаў перад дзяржавай па збожжаздачы калгасы Бабруйскага раёну і калгасьнікаў Заходняй вобласьці. Зьлёт ударнікаў заклікае ўсіх калгасьнікаў Слуцкага раёну, Бабруйшчыны і ўсёй БССР ашчэ больш узмацніць барацьбу за ўраджай, за ўдарнае і якаснае правядзеньне ўборачнай кампаніі, за першачарговае і добрасумленнае, з першага снопу, выкананьне абавязкаў перад дзяржавай, за заваяваньне ў гэтай ганаровай справе першынства на спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Усякім праяўленьням кулацкіх тэндэнцый, усякім спробам антысавецкіх элемэнтаў сарваць датэрміновае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай дамо сакрушальны адпор.

Зьлёт ударнікаў Случчыны запэўняе тав. Гікало, а ў яго асобе ўвесь ЦК КП(б)Б, што калгасы Слуцкага раёну пад непасрэдным бальшавіцкім кіраўніцтвам партарганізацыі здолеюць і ў далейшым адстаяць сацыялістычнае першынства і ўтрымаць за сабою права на бальшавіцкі сьцяг ЦК і СНК.

МЕНСКІ ГАРЗЕМАДДЗЕЛ ПАТУРАЕ АНТЫДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭНДЭНЦЫЯМ

1-га і 15-га кожнага месяца Менскі гарземанддзел атрымлівае з калгасаў і сельсаветаў весткі аб ураджайнасьці. Першыя-ж даныя, прысланыя з месц, сьведчылі аб імкненьні радзу праўленьняў калгасаў і сельсаветаў утаіць фактычную ўраджайнасьць з мэтай ашукаць дзяржаву. Вось факты: паводле вестак на 15-га чэрвеня калгасы імя Гамарніка і «Трэці вьезд» запраектавалі ўраджайнасьць па збожжы на 30 проц. ніжэй фактычнай ураджайнасьці; калгас імя Карла Маркса — на 43 проц., імя Дзяржынскага — на 25 проц.

З таго часу, як былі атрыманы весткі, прайшло 16 дзён.

Што зрабіў гарземанддзел, каб папярэдзіць антыдзяржаўныя, злачынныя спробы ўтаіць ад дзяржавы збожжа і разбазарыць яго? Што зроблена, каб выкрыць ашуканцаў, выявіць злачынствы?

Практычна нічога. Мала таго, гарземанддзел не зрабіў і ня думае рабіць ніякіх палітычных высноў з гэтых фактаў. Аграномы райза спакойна паправілі весткі аб ураджайнасьці, а кіраўнікі земаддзелу не зацікавіліся тым, чаму зьменшана фактычна ўраджайнасьць, хто даваў ашуканчыя лічбы.

Вінаватыя дагэтуль ня прыцягнуты да адказнасьці. Асноўную прычыну зьніжэньня даных аб ураджайнасьці загадчык гарза тав. **Жарын** бачыць у... складаньні форм уліку. З прычыны гэтага вельмі цяжка ўстанавіць фактычную ўраджайнасьць.

Такі фармальны, апартуністычны, вузка-дзяляцкі падыход земаддзелу да важнейшага пытаньня развязваў руки варожым элемэнтам, буржуазным перараджэнцам. Палітычная сьлепата работнікаў земаддзелу і мяккацелыя ліберальныя адносіны да жулікаў і ашуканцаў з калгасаў і сельсаветаў прывялі да таго, што ў апошнія дні прысылка ілжывых вестак набывае амаль сыстэматычны характар. Асабліва гэта заўважаецца па **Астрашыцка-Гарадзецкім сельсавеце.** Так, калгасы «Новы шлях» і «Зара» запраектавалі ўраджайнасьць па жыце на 14 проц. ніжэй фактычнай, па пшаніцы — на 20 проц., па бульбе — на 35 проц. Характэрна, што ў гэтых калгасах ураджайнасьць жыта ўстаноўлена ў 6 цэнтн. у той час, як у суседніх калгасах імя Сталіна і «Прамень сацыялізму» — 8-9 цэнтн. Факт ашуканства дзяржавы відавочны.

Як рэагаваў менскі земаддзел на пастанову ЦК КП(б)Б аб антыдзяржаўных тэндэнцыях у калгасах, у прыватнасьці, у калгасе імя Карла Маркса і на сычналы друкуў? Работнікі райза крыху занепакоіліся. Тэхнічны работнік па ўліку ўзяў пад сумненьне даныя аб ураджайнасьці, прысланыя з калгасаў «Зара» і «Новы шлях». Даволі было тэлефоннага званка, каб весткі аб ураджайнасьці былі выпраўлены і павялічаны. Аднак, кіраўнікі земаддзелу і зараз праяўляюць поўную бяздзейнасьць, не завастраюць увагі грамадзкасьці на палітычным значэньні гэтай справы.

Треба адзначыць, што і зараз у земаддзеле абмяжоўваюцца тым, што складаюць у папкі ілжывыя весткі. Дагэтуль не дадумаліся паслаць работніка для праверкі на месцы даных па калгасах і сельсаветах.

Гэта апартуністычная практыка земаддзелу невыдаткоўная. Яна вынікае поўнасьцю з своеасаблівага разуменьня ім сваіх задач. Справу ўліку ўраджайнасьці земаддзел разглядае, як тэхнічную справу, якую можна ў любы час механічна паправіць. У гэтым корань палітычнай сьлепаты, няўменьня разгледзець за лічбамі дзейнасьць клясавага ворага, які імкнецца сарваць здачу с.-г. прадукцыі дзяржаве.

М. Л.

48 цэнтнэраў збожжа—дзяржаве

ШКЛОЎ. У гонар другога раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў перадавыя калгасьнікі Чарнаруцкага сельсавету арганізавалі чырвоны абоз па здачы збожжа дзяржаве. Здарзена 48 цэнтнэраў жы

Фабрыканты Беластоцкай акругі ламаюць калдагавор

Перад новай забастоўкай салідарнасьці

З Беластоку паведамляюць, што пасьля спыненьня 13 тыднёвай гераічнай забастоўкі тэкстыльшчыкаў ў многіх пераважна дробных фабрыках Беластоцкай акругі забастоўка трывае да цяпер. Прамыслоўцы з ваколічных фабрычных пасёлкаў (Супрасьля, Васількова) адмаўляюцца ажыцьцяўляць заключаныя калдагаворы, ня гледзячы на тое, што саюз прамыслоўцаў у гэтым калдагаворы абавязаўся строга прытрымлівацца новага цэньніку зарплаты і што дагавор быў заключан пры ўдзеле інспэктара працы.

Асабліва ня хоча ні за што прызнаць новага цэньніку дырэкцыя вялікай фабрыкі «Цырон» у Супрасьлі пад Беластокам, выкручваючыся, што дэлегацыя з саюзу прамыслоўцаў, заключаючы дагавор з рабочымі, ня было ўпаўнаважана гэтай фірмай. Імкнучыся акупаваць выніні гераічнай забастоўкі, прагныя на эксплёатацыю капіталісты гавораць, што ўступаючы ў саюз прамыслоўцаў, яны пакінулі за сабой справу рэгуляваньня зарплаты рабочых. Зараз упасьнікі тэкстыльных фабрык пераспалі да саюзу прамыслоўцаў паведамленьні, што выступаюць з гэтага саюзу і адначасова адклікаюць свайго прадстаўніка з прэзыдыуму праўленьня гэтага саюзу.

Правакацыя фабрыкантаў выклікала вялікае абурэньне сярод рабочых Беластоку і акругі. У Беластоку адбыўся мітынг, у якім прымала ўдзел 2.000 тэкстыльшчыкаў. На мітынгу пастаноўлена правесьці аднадзённую дэманстрацыйную забастоўку ва ўсіх тэкстыльных фабрыках Беластоцкай акругі суброць паманьня калдагавору, здабытага доўгатрывалай забастоўкай.

Разам з тым на мітынгу пастаноўлена абавязаць кожнага працуючага тэкстыльшчыка ўносіць пэўную суму грошай штотыднёва ў фонд дапамогі бастуючым яшчэ тэкстыльшчыкам.

(«Трыбуна Радзецка»).

Далейшае закрыцьцё капальняў у Верхняй Сілезіі

ВАРШАВА, 2. Сацыял-фашысцкі «РОБОТНІК» паведамляе аб далейшым закрыцьці капальняў у ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ. Новыя тысячы рабочых выкінуты на вуліцу і пазбаўлены ўсякіх сродкаў на існаваньне.

Так, на днях закрыліся капальні: «ВІРЭК», «ФІСЫНУС» і «ФЛЁРЭНТЫНА», на якіх працавалі сотні рабочых. У выніку капіталістычнай рацыяналізацыі адбываецца далейшае скарачэньне рабочых на капальнях «БРОДЭ I» —300 ЧАЛАВЕК, «КСЁНЖЭНТКІ» — 120, «БІЛЬШОВІЦЫ»—100 І НА КАПАЛЬНІ «КОШАРАЎ»—75 ЧАЛ.

У дэмабілізацыйнага камісара ў каставіцах знаходзяцца прапановы аб увядзеньні прымусовага адпачынку для большасьці рабочых капальняў «ГЕСХЭ», «ПОКУЙ», «ВОЛЬФГАНТ-ВАВЭЛЬ», «РОДЗЯНКАЎ» і г. д.

(Уласн. інфарм.).

Візыт прадстаўнікоў данцыгскага ўраду ў Польшчы

ВАРШАВА, 2. (БЕЛТА). Урадавыя колы рыхтуюцца да прыёму данцыгскіх гасьцей: прэзыдэнта сэнату **Раўшнінга** і віцэ-прэзыдэнта **Грэйзэра**, якія прыбываюць заўтра ў Варшаву з аднадзённым візытам. Прадстаўніком данцыгскага сэнату рыхтуецца прыём, ні ў чым ня ўступаючы цэрыманіялу, які звычайна аказваецца прадстаўніком незалежнай дзяржавы. У праграму прыёму ўваходзіць прыём данцыгскай дэлегацыі прэзыдэнтам рэспублікі Масьціцкім.

Урадавы **«Кур'ер поранны»** заяўляе, што «Польшча толькі тады паверыць шчырасьці нацыянал-сацыялістычнага сэнату, калі сапраўды незалежная ад берлінскіх нашэптваньняў самастойная палітыка вольнага гораду стане рэальнасьцю».

Пералічваючы спрэчныя польска-данцыгскія пытаньні, **«Газэта польска»** падзяляе іх на тры катэгорыі: чыста палітычныя, гаспадарча-палітычныя і партовыя. Да першай катэгорыі «Газэта польска» адносіць пытаньні, якія датычацца юрыдычнага становішча польскага насельніцтва ў вольным горадзе, да другой — урэгуляваньне парнальнага тавараазвароту паміж Польшчай і Данцыгам. Да 3-й катэгорыі пытаньняў польскі афіцыёз адносіць пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй данцыгскага порту, супрацоўніцтва і ўхілеьне канкурэнцыі паміж Гдыняй і Данцыгам, якая зьяўляецца асабліва набалеўшым пытаньнем у момант сур'ёзнага гаспадарчага крызісу, які не дае магчымасьці загрузіць у дастатковай меры абодвы парты.

Германскі фашызм узмоцнена рыхтуецца да вайны

ПАРЫЖ, 2 (Белта). **«Дэр'ер Нувэль»**, якая выдаецца ў **Страсбургу**, паведамляе, што Германія, наперакор версальскаму дагавору, узмоцнена ўзбройваецца. Заводы «Рэйн мэтальвэрке» ў **Дюсэльдорфэ** выробляюць 150 міліметровыя гаўбіцы. Некаторыя заводы, якія выконваюць ваенныя заказы (металюргічныя, тэкстыльныя, хэмічныя, матэрабудаўнічыя) працуюць з поўнай нагрузкай. Рэйхсвэр поўнасьцю матарызаван. Вядзецца вялікая работа на падрыхтоўцы ваенных кадраў. Асабліваю ўвагу зьвяртаецца на павялічэньне нацыянал-сацыялістскай праслойкі сярод камскладу. Створаны курсы па павышэньні кваліфікацыі для 5.500 старшых афіцэраў, больш пасьцьці якіх нацыянал-сацыялісты. Многія кіраўнікі рэйхсвэру звольнены і заменены больш надзейнымі для нацыянал-сацыялістаў людзьмі.

ПАЗШ не згаджаюцца на аднаўленьне залатога стандарту

ЛЁНДАН, 2. (БЕЛТА). г. Рузвэльт адхіліў сумесную прапанову аб аднаўленьні залатога стандарту, высунутую «залатым блёкам» (краінамі, захаваўшымі залаты стандарт) і ўхваленую з боку Англіі. Рузвэльт указаў кіраўніку амэрыканскай арганізацыі **Хэллу**, што гэта прапанова непрыймальна «ў яе данай форме».

ЛЁНДАН, 2. (БЕЛТА). У колах сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, згодна паведамленьня газэт, учора ўвечары панавала «зьдзіўленьне» па поваду адмаўленьня Рузвэльта ўхваліць праект згоды аб стабілізацыі валют. Перадаюцца пэсымістычныя заявы французаў, што яны «расчараваны» і што канфэрэнцыя «сарвана». Перадаюць таксама аб пагрозе так званага «залатога блёку» пакінуць канфэрэнцыю. Разам з тым газэты выказваюць глыбокае спачуваньне старшыні «трэсту мазгоў» праф. МАЛЕЮ па поваду сумнага непаразуменьня, узьнікшага паміж ім і Рузвэльтам, бо вядома, што ён рэкамэндаваў прэзыдэнту зьвярнуць на праект згоды сваю спрыяльную ўвагу.

Аднак, у брытанскіх колах яшчэ ня зьнікла надзея на дасягненьне ў бліжэйшым будучым згоды паміж амэрыканскім і іншымі цэнтральнымі банкамі па пытаньні аб «часовым успакаеньні даляра».

Францускі друк аб скасаваньні эмбарго

ПАРЫЖ, 2. (БЕЛТА). Усе газэты публікуюць без каментараў паведамленьне аб скасаваньні эмбарго на савецкія тавары, якія імпартуюцца ў Англію. Каментары дае толькі «Эр Нувэль», якая ў артыкуле, надрукаваным на першай старонцы, выказвае задавальненьне з такога канцу справы. «Наогул было дзіўна—пішэ газэта—што Англія абумоўляе вырашэньне такога важнага пытаньня, як аднаўленьне эканамічных адносін з СССР, вызваленьнем двух брытанскіх грамадзян, якія заканамерна судзіліся судом свабодная краіны. Трэба падкрэсьліць, што ангельскія і савецкія прадстаўнікі далі доказ сваёй цьвярозасьці і свайго разуменьня эўрапейскіх інтарэсаў. У момант, калі прадстаўнікі дзяржаў, сабраўшыя ў Лёндане, стараюцца знайсьці сродак супроць бядот, якія не шкадуюць нікога, і такімі цяжкасьцямі стараюцца дасягнуць аднадушнай згоды англа-савецкі канфлікт значна ўскладняў іх задачу. Міжнародныя перагаворы могуць быць толькі палегчаны заключанаю згодаю».

Перад новай генэральскай вайной у Кітаі

ШАНХАЙ, 3. (БЕЛТА). Перагаворы паміж **Фын Юй-сянам** і **бэйпінскімі** ўладамі да гэтага часу не завяршыліся посьпехам. Газэты ўказваюць, што Фын Юй-сян, атрымаўшы абяцаньне ад лідэраў паўночна-заходняга Кітаю аб падтрыманьні, заняў непрымірную пазицыю. Згодна паведамленьня газэты **«Чайна Таймс»**, з прычыны напружанасьці становішча, бэйпінскае каманданьне накіравала бронецягнік у Нанькоў (на паўночны ўсход ад Бэйпіну), дзе ўжо знаходзяцца тры дывізіі нанкінскіх войск. Газэта «Сыньвень бао» паведамляе, што японскае каманданьне афіцыяльна адмовілася адклікаць войска з раёнаў **Міюна і Губейкоў**, матывуючы гэта тым, што дзейнасьць Фын Юй-сяна ў Чахары пагражае бясьпечнасьці правінцыі Жэхэ.

Перагаворы аб аднаўленьні простых зносін паміж КУЧ і Усурыйскай чыгункай

ТОКІЁ, 1. (БЕЛТА). Агенцтва «Сым бун Рэнго» паведамляе, што ў сувязі з двухразовым катэгарычным патрабаваньнем савецкай часткі праўленьня КУЧ аб аднаўленьні простых зносін на ст. Пагранічная і аб кампэнсацыі страт Усурыйскай чыгункі, старшыня праўленьня КУЧ Лі ШАО-ГЕН прыбыў ў ЧАНЬЧУНЬ, дзе вядзе перагаворы з манчжурскімі ўладамі.

Кампазытар А. Цікоцкі

„Апрычнікі" („Царская нявеста") у Беларускім Дзяржаўным тэатры опэры і балету

Аднэй з найбольш яркіх і выдатнейшых вынікаў у мастацкім жыцьці БССР апошніх год бясспрэчна зьяўляецца стварэньне беларускага дзяржаўнага тэатру опэры і балету. Тое, аб чым ва ўмовах царскай калёніяльнай Беларусі і марыць нельга было, тое, што было прывілеяй «імператарскіх» тэатраў Пецярбургу і Масквы, ды і там ствараласа на працягу многіх дзесяцігодзьдзяў на вялікадзяржаўніцкай, «сапраўдна-рускай» аснове—самае складанае з відаў мастацтва—опэра ў кіруемай бальшавіцкай партыяй савецкай краіне выраслa літаральна на нашых вачох на працягу яніх-небудзь двух-трох год у вялікай культуры тэатр.

Шмат працы, шмат энэргіі, упартай волі да перамаганьня ўсіх цяжкасьцяй, сапраўднага творчага энтузіязму ўкладзена кіраўніком тэатру і ўсім калектывам у стварэньне на Беларусі опэры. Цалкам акупіліся ўсе іх намаганьні, поўнасьцю аплочаны затраты—створана вялікарная культурная справа.

Аб гэтым, магчыма мала і няпоўна, але пісалі і гаварылі. Я, як кампазытар, хачу закрануць спэцыяльна музычны бок аднэй з пастановак тэатру. Прыехаўшы ў Менск, я пасьпяшыў паглядзець «Апрычнікі», най больш глыбокую з опэр Рымскага-Корсакава—«вялікага чараўніка пекнай паваярхоўнасьці», паводле слоў тав. Луначарскага. Я гэту опэру чуў ня раз у Ленінградзе і, па праўдзе гаворачы, ідучы ў тэатр, не ўяўляў, як гэта будзе гучэць тут пры нашых непараўнальна меншых і колькасна і якасна магчымасьцях. Трэба аддаць справядлівасьць—пачутае разагнала ўсё мае недавер'е і прымусіла з неаслабнай увагай тры разы праслухаць усю опэру з пачатку да канца.

Створаныя Корсакавым музычна-сцэнічныя вобразы надзвычай добра раскрыты артыстамі тэатру. Больш за ўсіх запамінаюцца т. Саліна — выключная выканальніца ролі Любашы, т. Дзянісаў у ролі Гразнова, т. Балоцін—у ролі Бамелія і т. Кроз у ролі Марфы. Трэба падкрэсьліць і выканаўцаў у іншых паказах т. т. Бандарэнка, Бжэзінскую, Калінўска га і Пігулеўска.

Вялізарная заслуга ў гэтым удалым раскрыцьці сьпевакамі сваіх воб разаў належыць заслужанаму артысту рэспублікі тав. Гіттарпу, мясцамі зусім па-новаму ўскрыўшаму складанейшую партытуру корсакаўскага опэрнага пісьма, якое дасягае ў «Апрычніках» амаль вагнэраўскай сілы і глыбіні. Як ярка гучыць у арке стры жудасная тэма «Грознага» цара, фразы Малюты і ўсёй апрычыны. Гэтыя гучаньні зусім апраўдваюць пераймаваньне опэры. Якім холадам вее ад «атручваючых» акордаў Бамелія, ад гэтых бязупынных чарга ваньняў акордаў мэдзі і струнных! І разам з гэтым як цёпла і тонка перадан складаненьны арнамэнт аркестровага суправаджэньня арыі Марфы ў 2-ім акце. Зразумела, піяніна, якое стаіць у лёжы—гэта ня арфа, а разьмеры аркестровага памяншаньня ў нашым тэатры не даюць магчымасьці разьмясьціць усіх патрабуемых корсакаўскай партытурай галасоў аркестру (труба, 4 валторны, шмат струнных), тым больш патрэбна было нязвычайнае майстэрства дырыжэра, каб прымусіць забыць усе гэтыя «дробязі» і дабіцца такой моцнай і роўнай гучнасьці аркестру.

Некалькі зьдзіўляе сваёй неадпаведнае усяму стылю спэктаклю, а часам проста незразумелае зьнешняе афарміленьне мастака Дзяніцкага.

Пастаноўшчык Вульф, ня гледзячы на асобныя ўдала знойдзеныя моманты (Марфа на арэлях), у большасьці выпадкаў (мізансцэны) перахадзіць пэўную неабходную меру рухаў і ў рэзультаце адцягвае ад галоўнага ў опэры—г. зн. музыкі. Забыты слова Корсакава аб тым, што опэра ёсьць перш за ўсё твор музычны. Нельга глядзець на музыку ў опэры, як на адзін з бакоў «афарміленьня» спэктаклю,—у опэры музыка ня форма, а зьмест, і таму пры выпрацоўцы пастановачнага пляну опэры трэба выходзіць з яе музыкі.

Ня гледзячы на асобныя промахі, застаецца бясспрэчным адзін вялізарнейшай важнасьці факт,—у малады опэрным тэатры ўжо адчуваецца вялікая культура і вялікае майстэрства. Ва ўмовах БССР гэты факт лішні раз пацьвярджае правільнасьць ленінскай нацыянальнай палітыкі, а нам, кампазытарам, стварэньне опэрнага тэатру служыць вялікім стымулам для работы над стварэньнем арыгінальнай беларускай опэры. Тэатр даў кампазытарам сацыялістычны выклік: стварайце арыгінальную опэру! І гэты выклік кампазытары абавязаны прыняць і выканаць.

Паведамленьні

Партканфэрэнцыя ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10-та ліпеня 1933 году, а 10-й гадзіне раніцы, у Менску (Савецкая, 55, III-ці паверх, 18-ты пакой) будзе працаваць камісія ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцыйных спраў наступных т. т.: **Айзэнбэрга Х. А.** (Менск), **Барабаша Я. І.** (Менск), **Бабенкава А. М.**, **Гаркая І. І.** (Ворша), **Гнецэцкіна І. Д.** (Менск), **Іваўнёва С. І.** (Віцебск), **Ісаенка Ф. М.** (Сянно), **Касікава П. Ф.** (Бягомль), **Кузьняцова Н. І.** (Менск), **Ляшэвіча І. А.** (Заслаўе), **Люнінскага С. Л.** (Менск), **Мышчыка Б. Б.** (Барысаў), **Мялешкіна М. І.** (Ворша), **Нарынкевіча П. С.** (Лагойск), **Нехамкіна Ш. Я.** (Менск), **Пярноўскага Б. Б.** (Клімавічы). **Панамарова Ф. Т.** (Менск), **Спрэкоўскага В. К.** (Менск), **Хрытунова Ф. С.** (Карма), **Шарфуна Я. І.** (Быхаў).

Яўка памянёных таварышоў абавязкова. Праезд не аплачваецца.

Выкліканыя т. т. павінны прадставіць да дня разгляду справы характарыстыкі парт'ячэйкі аб сваёй апошняй рабоце.

Запрашаюцца сакратары ячэек, на вучоце якіх знаходзяцца гэтыя т. т.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б
СУХАНАВА.

Згодна пастановы сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б чарговы нарадзень прысьвяціць прапрадоўцы пастаноў X-та пленуму ГК КП(б)Б.

6-та ліпеня, а 6-й гадз. у Доме Камасьветы склікаецца інструкцыйная нарада сакратароў партканкетываў і ячэек, прымаданых да прадпрыемстваў па пытаньні чарговага нарэшты.

Яўка сакратароў парткалектываў і ячэек абавязкова.

Менгарком КП(б)Б.

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!

ГАВОРЫЦЬ МЕНСК

УВАГА!

Усім Райвыканкомам, Гарсаветам, сельсаветам, райгазэтам, МТС, адбітак—Райпартакомам і Палітадзёлам МТС.
Усім загадчыкам радыёвузлоў, упаўнаважаным комітэту Радыёвяшчаньня.

10 ліпеня ў 22 гадз. па Маскоўскаму часу цвх СССР

арганізуе

УСЕСАЮЗНУЮ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ,

прысьвечаную

конкурсу на лепшы па рабоце сельскі савет,

праз перадатчык РЦЗ на хвалі 1875 мэтраў.

З дакладам аб задачах саветаў па ўборачнай і загатоўчай кампаніі выступіць Старшыня ЦВК СССР М. І. КАЛІНІН.

Радыёканкомы абавязаны забясьпечыць максімальнае слуханьне радыёперакліччы ў рабочых, калгасных клюбах, домах сацкультуры, МТС, саўгасах, калгасах і ўсіх калектывах.

Першы дзень дынамаўскіх спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы ў Менску

А 10 гадзіне раніцы 3-га ліпеня ў Менску на пляцу дывізійнага стрэльбішча пачаліся ўсесаюзныя дынамаўскія куставыя лёгка-атлетычныя спаборніцтвы, у якіх прымаюць удзел каля 100 лепшых фізкультурнікаў-дынамаўцаў (значкоўцаў) Беларусі, Паўночнага краю, Заходняй вобласьці і Івана-прамысловай вобласьці.

Спаборніцтвы па стральбе з дробнакаліберай вінтоўкі праходзілі на дыстанцыі 25 мэтраў, разьмер мішэні Д-25, норма — з 50 магчымых ня менш 35 ачкоў у сярэднім на ўдзельніка. Усяго даюцца 8 патронаў, з іх 3 пробных без абмежаваньня часу і 5 заліковых з абмежаваньнем часу ў 5 мінут.

Пасьля стралковых спаборніцтваў усе ўдзельнікі прайшлі 500 мэтраў у процівагазе, што таксама ўваходзіць у вайскова-спартыўны камплекс спаборніцтваў.

Папярэднія вынікі стралковых спаборніцтваў паказалі, што ў асноўным па стральбе лепш за ўсіх ішлі ўдзельнікі Івана-прамысловай вобласьці, якія перавыконвалі заданьне.

Пэрсанальна стралялі добра: т. **Папоў** (Івана-прамысловая вобласьць), які даў 46 ачкоў з 50 магчымых, тав. **Цімашкіна** (Заходняя вобласьць) — 44 ачкі, т. **Карпаў** (Івана-прамысловая вобласьць) — 44 ачкі, **Сінюта** (БССР) —44 ачкі, **Касьпіровіч** (БССР) — 43, **Аппатава** (БССР) — 42 ачкі.

На гэтым дзенным спаборніцтвы на стральбе скончыліся.

З 6 гадзін 3-га ліпеня спаборніцтвы пачаліся на Ўсебеларускім стадыёне на наступных відах лёгкай атлетыкі:

для мужчын — бег на 100 мэтраў, прыжкі ў вышыню з разьбегу, індывідуальнае мятаньне кап'я і шведзкая эстафэта;

для жанчын — бег на 100 мэтраў, індывідуальнае метаньне ядра, камандное мятаньне дыску і шведзкая эстафэта.

У гонар адкрыцьця спаборніцтваў з 7 гадзін на Ўсебеларускім стадыёне наладжаны футбольны матч паміж каманда мі «Дынамо» і зборнай прафсаюзаў Менску.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЬПІС ТАВАРЫШОЎ, ВЫЛУЧАНЫХ ДАКЛАДЧЫКАМІ ДЛЯ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Тав. **Пасэ** (ЦК) — завод імя Варапылава, **Злоткін** (ЦК) — «Камунар», **Канаплін** (ВАН)—«Бальшавік», **Розін** (Упраў служба эксплёатацыі), **Любін** (Дом Наркамасьветы) — ДЗ-6, **Сакольчык** (Белторф) — трамваяры, **Ермакоў** (БДУ) — Саюзтранс, **Ляхаў** (Наркамфін) — Белдзяржбуд, **Шастакоў** («Калгасьнік Беларусі») — Менбуд, **Задзярнюк** (ЦК) — Водаканалпрэст, **Лебедзеў** («Калгасьнік Беларусі») — Дом Ураду, **Верба** (Белкалгасаюз) — Энергабуд, **Улазаў** (НКА) —трушком будаўнікоў, **Выдра** (ВКСГЦВ) — завод стандартных дамоў, **Зярніцін** (КІЖ) — завод малочных кіслот **Цыпіна** (ЦК) — пчтацінная фабрыка, **Зянковіч** (гарана) — завод ланцугоў Гальля, **Саўкоў** (кіраўніцтва ашчадкасамі)—арцель «ДА», **Асаўляк** (ГК КП(б)Б) — раённы камітэт узаемадапамогі, **Шэпіра** (ГК КП(б)Б) — фабрыка імя Тэльмана, **Усс** (БелАН) — Прамзбытсаюз, **Белкін** (Наркамюст) — прамгарч, **Кісельгоф** (Наркамюст) — цагельня № 1, **Паўловіч** (ГК КП(б)Б) — цагельня № 1-3, **Гапоненка** (Наркамюст) — цагельня № 2-4, **Лодысеў** (ОНК) — цагельня № 3, **Дубнаўскі** (СНК) — цагельня № 5-6, **Гукаў** (Наркамюст) — цагельня № 8.

Дубіна (ЦС ААХ), **Александровіч** (арбіюро пісьменнікаў), **Багаслаўскі** (ЦК), **Зэгер** (Наркамюст), **Вітпін** (ЦК) — палітадзел Н-скай кав. дывізіі.

Грысевіч (Наркамлёсправ), **Запескі** (Наркамзем), **Ацкін** (Белдзяржпрэст), **Страпкоўскі** (Наргасвучот). **Бялуга** (Наркамасьветы) — палітадзел Н-скай беларускай дывізіі.

Рыўкін (Наркамюст), **Валодзька** (кіраўніцтва сувязі), **Сакапенка** (Наркамцяж), **Мышпаў** (ЦП саюзу кваш. і дзяржгандлю), **Гнілякевіч** (ЦВК) — палітадзел Н-скай стралковай дывізіі.

Адзінец (ЦК), **Гурпо** (ленінскага-энгельс. інстытут), **Амбражунас** (Упраўнаркамцяжпрам), **Лынькоў** (арт. бюро пісьменнікаў), **Жарскі** (газэта «Орка») — УВСР —98.

Файнбэрг (кіраўніцтва сувязі)—УВСР —90, **Окур** (ВКОГПІ) — УВСР—61, **Кантаровіч** (Наркамасьветы) — УВСР—92, **Патапейка** (ЦСПСВ) — УВСР—93.

РЭЗЭРВ:

Зайчык (Галоўсацстрах), **Фрэйдлін** (НКЮ), **Гурэвіч** (пракуратура), **Шулькін** (ГСПС), **Капілевіч** (гарсавет), **Карэнеўскі** (гарсавет), **Елянеўскі** (гарсавет), **Рубін** (ЦК), **Вільчык** (ЦК), **Дзяніскевіч** (ЦК), **Дынун** (гарсавет ААХ), **Кудзельскі** (Наркамюст), **Балабанава** (НКЮ), **Багарад** (ЦП саюзу грам. харч.), **Жолудзеў** (Наркамсобгасаў), **Стальмашонак** (мадінстытут), **Пятровіч** (Дзяржплян), **Шусэрман** (Наркамлёсправ), **Мінін** (ЦК), **Мірэнгоф** (ЦККК), **Журэмскі** (Загатзбожжа), **Карбоўскі** (палітадзел Н-ай дыв.), **Зарын** (палітадзел Н-скай кав. дыв.), **Юнг** (штаб корпусу), **Пракопчык** (калгасны інстытут), **Эпштэйн** (ЦК), **Громаў** (мадінстытут), **Калугін** (ДПУ), **Альпінская**, **Давідовіч** (ЦКК), **Мікульскі** (Дзяржбанк), **Войцэн** (гарКК), **Пятрушэня** (Наргасвучот), **Сыцько** (БелАН), **Турэцкі** (гарсавет), **Нікалаеў** («Зьвязда»), **Сарбэнта** (БелАН), **Аўчынькіў** (ВКОПШ), **Мархачоў** (ЦП керамікаў), **Манаў** (фін.-экан. інстытут), **Іешчанка** (фін.-экан. інст.), **Мяжуеў** (гарКК), **Турко** (ЦК).

Усе таварышы павінны зьявіцца 5-га ліпеня г. г. роўна а 6-ай гадзіне ўвечары на прушаную кансультацыю ў памяшканьне Дому Камасьветы, пакой 19 (уваход з вул. Энгельса) і зараз-жа дагаварыцца з парткалектывамі і ячэйкамі аб часе і месцы сходу.

Ячэйка ЛКСМБ ЦСПСБ выказвае свой глыбокі ж а л ь з прычыны заўчаснай сьмерці лепшага бальшаніка-камсамольца, сакратара гаркому ЛКСМБ, члена бюро ЦК

Колі МАЛЕЯ.

Бюро парткалектыву, заўком і камсамольскі калектыў чырвонасьцяжнага машына-будаўнічага заводу імя Варапылава з вялікім жалем паведамляюць аб заўчаснай трагічнай сьмерці актыўнага камсамольца, рабочага заводу таварыша

КАЗІНЕЦ Барыса Мзэравіча

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Вялікі замежны мастацкі фільм ЖЫЦЬЦЁ за ЖЫЦЬЦЁ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Замежны фільм Ракавыя прыкметы

ПРАЛЕТАРЫ Новы замежны фільм з прыгодніцк. каўбойск. жыцьцём КЛЯЙМО „Б"

СПАРТАК Каса—з 3 г. 30 м. Мастацкі фільм ПАТОМАК АРАБА драма ў 7 частках.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ Кіно-тэатр Савецкая. 90

СЁНЬНЯ

КІНО-ФІЛЬМА ў 3-х сэрыях

ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯБАЛЯТЫ

ПАЧАТАК СЭАНСАЎ з 2 гадз. дня.

Каса адкрыта з 1 г. дня.

Адкрыт асенні прыём у Бабруйскую аўта-манцёрную школу Дарбудвучу Галоўдартрансу БССР

У школу прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 16-ці да 19-ці год з асьвятой ня ніжэй 7-годзі.

Заявы прымаюцца да 20 жніўня г.г. у канцылярыі школы (гор. Бабруйск, рог вуліц Ленінскай і Кастрычніцкай). Да заявы прыкладваюцца наступныя дакументы: 1) аб асьвеце; 2) сацпахаджэньні; 3) сац. становішчы; 4) узросьце; 5) стан здароўя.

Задачыя ў школу атрымліваюць зарплату ад 32 руб. да 50 руб. і ўсе забясьпечваюцца інтэрнатам. На працягу вучобы зарплата прагрэсіўна павялічваецца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці. Пры школе ёсьць сталоўка.

Тэрмін навучаньня ў школе 2 гады.

Пасьля скончэньня школы вучні атрымліваюць спэцыяльнасьць аўтарэмэнцёра з шафёрскім ухілам. Да дакументаў абавязкова прыкладзі паштовых марак на 40 к.

Адміністрацыя школы.

Бабруйскі лесатэхнічны тэхнікум

абвяшчае

чарговы набор студэнтаў

на першы курс 1933-34 навуч. году на аддзяленьні:

1) фанэрнае—60 асоб; 2) сталярна-будзталяй і дэталяй сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва—30 асоб на дзенны і 60 асоб на вячэрні.

У тэхнікум прымаюцца скончыўшыя сямігодкі, вячэрнія школы павышанага тыпу і іншыя школы адпавядаючыя праграмам сямігодак, або скончыўшыя падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікум з абавязковым трыманьнем іспытаў па: грамадазнаўству, беларускае і літаратуры, расійскай мове і літаратуры, матэматыцы і фізыцы ў аб'ёме ведаў праграм сямігодкі.

Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву на імя прыймовай камісіі па адрасе: г. Бабруйск, Савецкая 76, Лесатэхнікуму— да 20 жніўня. З 20 па 28 жніўня праходзяць іспыты па вызначаных дысцыплінах. Заняткі пачнуцца з 1 верасьня.

Да заяў павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: 1) анкета, засьведчаная прафарганізацыяй, а для сялян—сельсаветам, 2) пасьведчаньне аб адукацыі (абавязкова арыгінал), 3) пасьведчаньне аб сацыяльным паходжаньні і праве голасу паступаючага і бацькоў, сац. становішча ў сучасны момант (сялянам даведкі ад сельсавету аб рэзьмеры сель-гаспадарчага на датку), 4) мэтрычную спраўку, 5) даведку аб адносінах да вайсковай павінасьці, 6) даведку ад дактара аб стане здароўя, 7) дзьве фотакарткі, 8) паштовых марак на 40 кап.

Пры адсутнасьці якіх-небудзь дакументаў з вышэй пералічаных прыймовай камісіяй заява ня будзе разглядацца.

Прынятыя студэнты ў адпаведнасьці з пасьпяховасьцю, сац. становішчам і забясьпечанасьцю атрымліваюць дыфэрэнцыяваную стыпэндыю на 1-ым курсе да 50 руб., інвагародніх студэнты будуць забясьпечваца інтэрнатам, а ўсе студэнты харчаваньнем у сталоўцы і пайком нароўні з рабочымі трэсту фанэрнай прамысловасьці, якому тэхнікум падпарадкаван (1 сьпіс, 1 катэгорыя).

Правілы для паступаючых на вячэрні курс тэхнікуму тыя ж што і на дзенны за выключэньнем таго, што навучаньне на вячэрнім праходзіць без адрыву ад вытвор часьці.

Дырэктар тэхнікуму
ШТЫЦКО.

РАБФАК У КАМБІНАЦЕ імя 10-годзьдзя БССР,

ЛЮБАНЬСКАГА РАЁНУ,

абвяшчае асенні набор на ўсе 4 курсы:

На 1-ы курс прымаюцца асобы, скончыўшыя 4 групы, на 2-гі—5—6 груп, на 3-ці—ШКМ, на 4-ы—прафшколу.

Усе студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і снабжаюцца па 1-й катэгорыі рабочых даваў мясцовасьці.

Студэнты 4-га курсу забясьпечваюцца стыпэндыяй, а студэнтам I-га, II-га і III-га курсу будзе прадастаўлена праца на вытворчасьці.

Заявы прымаюцца да 1-га верасьня.

Да заявы павінны прыкладацца наступныя дакументы: камандыроўку ад савецкіх, партыйна-камсамольскіх, саюзных арганізацый, анкету, даведку аб сац. становішчы з абавязковым указаньнем падатку за апошнія 2 гады, дач калгасьнікаў—аб падатку да ўступленьня ў калгас, аб вытворчым стажы, мэтрыку, аб асьвеце, аб стане здароўя.

Заняткі пачнуцца з 10-га верасьня г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1933-34 навучальны год

на 1-ы курс фізыка-матэматычнага і хэміка-біялёгічнага аддзяленьняў дзённага і вячэрняга інстытуту.

Інстытут рыхтуе выкладчыкаў фізыкі, матэматыкі, хэміі, прыродазнаўства для школ дзесяцігодак, рабфакаў, тэхнікумаў, ФЗВ.

Тэрмін навучаньня—3 гады.

Усе паступаючыя ў інстытут павінны будуць трымаць іспыты ў жніўні месяцы.

Умовы прыёму агульныя для ўсіх ВНУ і зьмешчаны ў спэцыяльным даведніку НКА для паступаючых.

Заявы з дакумантамі прымаюцца з 1-га чэрвеня па 20-га жніўня па адрасе: Гомель, Пралетарская 2. Па гэтым-жа адрасе накіроўваць даведкі.

Да заяў неабходна прыкласьці наступныя дакументы:

а) засьведчаную анкету, б) даведку аб сацыяльным становішчы падаючага заяву і яго бацькоў да 1 пасьля рэвалюцыі, в) аб адукацыі, аб годзе нараджэньня, г) аб стане здароўя, д) аб адносінах да вайсковай службы, е) дзьве фотакарткі.

Дакументы павінны быць у арыгіналах, копіі на прымаюцца.

Пачатак заняткаў—1-га верасьня.

Адначасова абвяшчаецца працяг прыёму заяў з дакументамі на падрыхтоўчыя курсы для паступленьня ў падінстытут. На курсы прымаюцца рабочых, калгасьнікі, працоўныя з асьветай 7—8 груп школы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ЖУРЫ па конкурсе Саўнаркому БССР

на ДРАМАТЫЧНЫЯ ТВОРЫ

паведамляе,

штоўсе матар'ялы для журы

павінны быць накіраваны па адрасе: Менск, Наркамасьветы, сэктар мастацтва, для журы конкурсу СНК БССР.

ЖУРЫ.

Птушкасаўгас Жлобінскага

ПТУШКАПРАМЫСЛОВАГА КАМБІНАТУ САЮЗПТУШКАПРАДУКТУ

ПРАДАЕ

пародзістыя куры „Рот Айланд" і качан пароды „Пэкіны", „Бягуны" выводу 1932 г.,

а таксама маладняк 2—3 месячнага ўзросту, выводу 1933 году, чыстапародны.

Адрас: Жлобін, птушкакамбінат, тэлеграфны: Жлобін, Яйцо.

На падставе пастановы СНК СССР ад 16-III—1933 г. распараджэньня ЦДТ ад 25-III—33 г.,

Магілеўскі дарожна-будаўнічы тэхнікум

ЛІКВІДУЕЦЦА

з 1-га ліпеня г. г. (зьліваецца з Менскім аўта-дарожным тэхнікумам). Усякія прэтэнзіі прыймаюцца ліквідкомам

да 10-га ліпеня г. г.

Усе былыя студэнты тэхнікуму, а таксама і былыя курсанты курсаў дарожных тэхнікаў, дзеасітнікаў і машыністаў,

аблігацыі якіх па пазыках „Пяцігодка—за 4 гады" і 3-га рашучага" знаходзяцца ў т